Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі і славянскіх народаў

Рэг. № УМ(К)-26-1-24/2020

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
__________ С.А.Талмачова
27.05.2020

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________ В.П.Скок
27.05.2020

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

## ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

па спецыяльнасці
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

Складальнік:
М.М.Сакалоў, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Разгледжаны і зацверджаны
на пасяджэнні Савета БДПУ 25 чэрвеня 2020 г., пратакол № 9

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі і славянскіх народаў

Рэг. № ___________________________

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| ______________С.А.Талмачова | _________________В.П.Скок |
| ____________________________ | ____________________________ |

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**

**ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ**

па спецыяльнасці
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

Складальнік**:**
М.М.Сакалоў, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Разгледжаны і зацверджаны
на пасяджэнні Савета БДПУ _____ ____________ 2020 г., пратакол № ______

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя культуры Беларусі” прызначаны для атрымання адукацыі на 1 ступені па спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

Вучэбна-метадычны комплекс накіраваны на замацаванне ведаў ў галіне гісторыі айчыннай культуры як на ўзроўні фактаў, так і на ўзроўні іх тэарэтычнага і канцэптуальнага асэнсавання. Асаблівасцямі дадзенага вучэбна-метадычнага комплексу з’яўляюцца спроба сфарміраваць уяўленне аб месцы і ролі культуры Беларусі ў гісторыі беларускага народа, у гісторыі еўрапейскай і сусветнай культуры; выхоўваць пачуццё патрыятызму і гонару за беларускі народ, яго дасягненні ў гістарычным мінулым і на сучасным этапе , авалоданне студэнтамі асноўнымі тэарэтычнымі дасягненнямі гістарычнай навукі, апрацоўку, асэнсаванне і сістэматызацыю вучэбнай інфармацыі, набыццё практыкаарыентаваных уменняў.

**ЗМЕСТ**

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА……………………………………………..……3
ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ…………………………………………...…4
ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………………....17
Планы практычных заняткаў……………………………………….17
РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ……………………..…………………..27
Пытанні да заліку па гісторыі культуры Беларусі……………...…………27
Тэмы рэфератаў…………………….…………………………………......29
Самастойная кантралюемая работа студэнтаў……………………….…31
ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ……………………….…………………32
Вучэбная праграма…………………………………………………….…32

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Неабходнасць вывучэння курса «Гісторыя культуры Беларусі» абумоўлена павышэннем ролі сферы культуры ў сучасным свеце, значнасцю ведаў аб нацыянальных традыцыях для падрыхтоўкі высокакваліфікаванага спецыяліста ў галіне гісторыі, увядзеннем у школьную праграму прадмета “Сусветная і айчыйная культура”.

Курс закліканы замацаваць у студэнтаў сістэматычныя веды ў галіне гісторыі айчыннай культуры як на ўзроўні фактаў, так і на ўзроўні іх тэарэтычнага і канцэптуальнага асэнсавання; сфарміраваць уяўленне аб месцы і ролі культуры Беларусі ў гісторыі беларускага народа, у гісторыі еўрапейскай і сусветнай культуры; выхоўваць пачуццё патрыятызму і гонару за беларускі народ, яго дасягненні ў гістарычным мінулым і на сучасным этапе.

Вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне «Гісторыя культуры Беларусі» падрыхтаваны для студэнтаў 3 курса спецыяльнасці 1-02 01 01 “Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны”. Дадзены ВМК складаецца з тэарэтычнага і практычнага раздзелаў, радзелу кантролю ведаў па дысцыпліне, дапаможнага раздзелу. Яго выкарыстанне будзе садзейнічаць усебаковаму азнакамленню студэнтаў з галоўнымі накірункамі вывучэння гісторыі айчыннай культуры ў беларускай і замежнай навуцы, вывучэнню найважнейшых з'яў, працэсаў, твораў, тэндэнцый і заканамернасцей яе развіцця; разуменню адметных рысаў культуры беларускага народа нарозных этапах яго гістарычнага развіцця, а таксама гісторыі культуры Беларусі ў кантэксце гісторы і культуры славянскіх народаў, еўрапейскай і сусветнай культуры.

Змешчаны ў вучэбна-метадычным комплексе матэрыял дазваляе забяспечыць засваенне базавага аб'ёму ведаў па дысцыпліне «Гісторыя культуры Беларусі», а таксама арганізаваць планаванне самастойнай працы студэнта пры вывучэнні курса.

# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## Тэксты лекцый

## Культура Беларусі ў IX – першай палове XVII стагоддзяў

**Культура Беларусі X – XIII стст.**

З прыняццем хрысціянства і развіццём феадальных адносін культура падзяляецца па саслоўным прынцыпе на два накірункі – традыцыйную (ці народную) культуру і культуру пануючага класа. Культура пануючага класа была амаль аднолькавай на ўсёй тэрыторыі Кіеўскай Русі, бо яе фундамент – візантыйскае праваслаўе, агульная пісьменнасць, заснаваная на старажытнарускай мове, агульныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя інтарэсы. Традыцыйная культура ў кожнай мясцовасці мела свае асаблівасці, значныя адрозненні, характэрныя для плямёнаў, ад якіх пайшло мясцовае насельніцтва.

Вусная народная творчасць – самая развітая галіна традыцыйнай культуры. Бытавалі каляндарна-абрадавыя песенныя цыклы (прысвечаныя язычніцкім святам і сельскагаспадарчым работам – Масленіцы, Русальнаму тыдню, Купаллю, Дажынкам), сямейна-абрадавыя песні (цыклы для вяселля, пахаванняў). Шырока распаўсюдзіліся казкі-быліны, паданні, легенды, прыказкі, загадкі, замовы. Сярод былін выдзелім “Вальга Святаславіч і Мікула Селянінавіч”, “Дабрыня-сват” (пра сватаўство да Рагнеды Ўладзіміра). Але быліна распавядала пра станаўленне феадальных адносін, а таму характэрна была і для культуры пануючага класа.

Пачынаючы з IX ст., на ўсходнеславянскіх землях шырока распаўсюджваецца пісьменнасць на базе кірылічнага алфавіта (выцесніла рунічную пісьменнасць). Кірыліца была складзена ў 863 г. братамі Кірылам і Мяфодзіем для старабалгарскай мовы, але распаўсюдзілася амаль сярод усіх славянскіх народаў. Спрыяла гэтаму прыняцце славянамі хрысціянства і пераклад святых тэкстаў на славянскія мовы. На Беларусі засталося няшмат помнікаў пісьменнасці, большасць з іх – унікальныя рэчы.

Першы датаваны надпіс ва Ўсходняй Еўропе – пячатка князя Ізяслава (княжыў да 1001 г.) з імем князя на грэчаскі лад – “Ізяславос”. Выдатным помнікам пісьменнасці з’яўляюцца “Барысавы камяні”, якія размяшчаліся ў рэчышчы Заходняй Дзвіны. Па загадзе сына Ўсяслава Чарадзея, князя Барыса (Рагвалода) на вялікіх камянях – язычніцкіх сімвалах былі нанесены надпісы “Господі помозі”, “Сулібор хрест” і выбіты шасціканцовыя крыжы (1120-я гг.). Берасцяныя граматы XI-XV стст. знойдзены на Беларусі ў Віцебску і Мсціслаўлі. Яны выкананы на берасцяной кары – бяросце. У Бярэсці археолагі знайшлі драўляны грэбень з паслядоўна размешчанымі літарамі кірыліцы – “букваром”, адносіцца ён да XIII ст.

Найбольш каштоўныя помнікі пісьменнасці – гэта рукапісныя кнігі. З XI-XIII стст. захавалася няшмат кніг. Яны былі вельмі рэдкія і ў тыя старажытныя часы. Вырабляліся з пергаменту – спецыяльна апрацаванай скуры маладых жывёл. На адну кнігу трэба было выгадаваць невялікі статак цялят. Да таго ж кнігі перапісвалі ўручную, гэта быў вельмі марудны працэс.

Самая ранняя рукапісная кніга на Беларусі – гэта Тураўскае евангелле XI ст. Яшчэ вядомы Полацкія евангеллі XII-XIV стст., Аршанскае евангелле XIII ст. Акрамя царкоўнай літаратуры распаўсюдзілася свецкая літаратура. Перш за ўсе – гэта летапісы. Ёсць звесткі аб існаванні Полацкага летапісу (ім карыстаўся В.М.Тацішчаў), які не захаваўся. Агульным летапісам Кіеўскай Русі з'яўляецца "Аповесць мінулых гадоў", што была напісана манахам Нестарам у Кіеве ў пачатку XII ст. "Слова аб палку Ігаравым" змяшчае цікавую інфармацыю пра полацкіх князёў (Усяслаў Чарадзей). Аўтар спрыяльна ставіўся да полацкіх князёў, а ў тэксце сустракаюцца словы, характэрныя да заходніх зямель Кіеўскай Русі. Гэта дало падставу некаторым даследчыкам сцвярджаць, што аўтарам з'яўляецца жыхар ці выхадзец са старажытнабеларускіх зямель. Час стварэння "Слова…" – 1185-1187 гг.

З распаўсюджаннем хрысціянства і з'яўленнем сваіх славянскіх святых з канца XII ст. пашыраецца мясцовая агіяграфічная літаратура – "жыціі" і "хаджэнні" святых. Вядомы "Жыціе і хаджэнне Еўфрасінні Полацкай" (да 1187 г.), "Жыціе Кірылы Тураўскага", "Жыціе Аўрамія Смаленскага" (напісана яго вучнем Яфрэмам каля 1240 г.), "Хаджэнне Ігнація Смалянiна".

Вялікую спадчыну пакінуў Кірыла Тураўскі (жыў каля 1130-1182 гг.). Вядомы яго 8 "слоў"-пропаведзяў, 2 каноны, некалькі аповесцяў, каля 30 малітваў-споведзяў. Асноўная тэма, якая турбавала "Златавуста" – духоўная дасканаласць чалавека.

Клімент Смаляціч (?–1164 гг.) – адзін з першых славян, які займаў пасаду кіеўскага мітрапаліта. Знакаміты як вялікі кніжнік, але захаваўся толькі адзін яго твор – "Пасланне Фаме прасвітэру", у якім ён адстойвае самастойнасць мясцовай хрысціянскай царквы перад канстантынопальскім патрыярхам Фамой.

Вялікае месца ў гісторыі культуры Беларусі займае Еўфрасіння Полацкая (1110–1173 гг.), дачка малодшага сына Ўсяслава Чарадзея. Яна перапісвала і перакладала кнігі, засноўвала манастыры (Спаскі жаночы і прсв. Багародзіцы мужчынскі) і школы для дзяцей пры іх, была фундатарам цэркваў і выдатных помнікаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Па загадзе Еўфрасінні полацкі дойлід Іаан пабудаваў Спаскую царкву (каля 1132-1159 гг.), а распісаў царкву фрэскамі мастак Кузьма з памочнікамі (згодна з надпісам на сцяне храма). Па заказе Еўфрасінні полацкі майстар-залатар Лазар Богша ў 1161 г. выканаў шасціканцовы крыж – святыню Беларусі. На драўлянай аснове мацаваліся 11 залатых пласцін, аздобленых перагародчатымі каляровымі эмалямі з выявамі святых, каштоўнымі камянямі. Бакі крыжа абкладзены сярэбранымі пазалочанымі пласцінамі, на якіх нанесены надпіс – гісторыя стварэння крыжа, імя майстра, праклён магчымым злодзеям. Такім чынам, крыж – помнік дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, помнік пісьменнасці, хрысціянскі помнік старажытнай Беларусі.

Аб высокім узроўні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў старажытных беларускіх княствах гавораць знаходкі прадметаў рамесніцкай вытворчасці – разных з косці і дрэва гронкаў нажоў, грабянёў, лыжак, шахматных фігурак (знойдзены ў Ваўкавыску, Лукомлі, Гародні). Майстры-залатары авалодалі складанай тэхнікай філіграні, гравіроўкі, залачэння, чэрні, зярнення.

Важнае месца ў шматграннай культуры старажытнай Беларусі займае архітэктура. Беларускі даследчык культуры М.М.Шчакаціхін яшчэ ў 20-я гг. ХХ ст. выдзяліў дзве архітэктурныя школы культавага будаўніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі, што адрозніваліся па віду кладкі плінфы, дэкору, памерам і планіроўке пабудоў.

Полацкая будаўнічая школа атрымала вялікі ўплыў візантыйска-малаазіацкага будаўніцтва. Выкарыстоўвалася муроўка з пахаваным радам цэглы (адзін рад цэглы ўтапліваўся глыбей і затынкоўваўся, вонкавая тынкоўка адсутнічала), інтэр'ер (унутраная прастора) аздаблялася фрэскамі – рознакаляровымі роспісамі па сырой тынкоўцы. Выдатнымі помнікамі полацкай будаўнічай школы з'яўляецца Сафійскі сабор (1050-я гг.), Спаская (Спаса-Еўфрасіньеўская) царква (1132-1159 гг.), храмы ў Бельчыцах (XII ст.), Дабравешчанская царква ў Віцебску – ці Царква Звеставання (1-ая палова – сярэдзіна XII ст.) а так сама храмы ў Мінску, Ноўгарадзе, Смаленску.

Гарадзенская архітэктурная школа прадстаўлена помнікамі – Барысаглебскай царквой на Каложы (Каложская царква) ў Гродне, пабудаванай ў апошнюю чвэрць XII ст.; незавершанай царквой у Ваўкавыску XII ст.; гродзенскай Прачысценскай царквой XII ст.; гродзенскай Ніжняй царквой пабудовы XII ст. (загінула пад час пажару 1183 г.), а таксама храмамі ў Тураве, Новаградку, Мінску і інш. Асаблівасці тэхнікі гродзенскай школы – выкарыстанне ў муроўцы плінфы (тонкай цэглы) разам з абцёсаным камнем і дэкаратыўнай маёлікавай пліткі, а таксама галаснікоў – керамічных гаршкоў, умараваных у сцены для паляпшэння акустыкі. Для аздаблення выкарыстоўваліся фрэскі і мазаіка. Гэта гаворыць аб уплыве візантыйскай, балканскай і каўказкай традыцый будаўніцтва.

Выдатным прыкладам ваеннага дойлідства на Беларусі з'яўляецца Камянецкая ці Белая вежа, пабудаваная ў Камянцы сучаснай Брэсцкай вобласці дойлідам Алексай у XIII ст. Рэшткі падобных вежаў знойдзены ў Полацку, Гародні.

Музычная культура мела некалькі накірункаў. Адным з замоўцаў выступаў княжаскі двор, дзе патрабаваліся выканаўцы цэрыманіяльнай і ваеннай музыкі. У межах хрысціянскай праваслаўнай царквы музычныя інструменты не выкарыстоўваліся, але склаўся знакаміты знаменны распеў. Наогул, царква выступала супраць народнай музычнай культуры, прадстаўленай скамарохамі, спевакамі з гуслямі, жалейкамі, бубнамі. Апошніх вельмі шанаваў просты люд і часта прымалі пры дварах феадалаў.

**Культура Беларусі XIV – XVI стст.**

Беларускія землі мелі параўнальна высокі ўзровень эканамічнага развіцця, таму больш важную ролю ў княстве адыгрывала беларуская мова і культура. Беларуская мова выкарыстоўвалася як дзяржаўная, а так сама ў дамашнім абіходзе вялікіх князёў і феадальнай знаці. У выніку развіцця феадальнага грамадства ў межах этнічнай тэрыторыі Беларусі ў XIII – XVI стст. утварылася беларуская народнасць.

XV – першая палова XVII стст. – перыяд развіцця культуры , які атрымаў у Еўропе назву Адраджэнне. Ён характарызаваўся ўздымам свецкай навукі і

мастацтва, станаўленнем нацыянальных моў, літаратур і нацыянальнай самасвядомасці, гуманістычным светапоглядам. Дзякуючы трывалым сувязям з Еўропай, беларуская культура так сама пазнала ўплыў ідэй Адраджэння, але тут меліся свае асаблівасці. Вялікае княства знаходзілася на перыферыі еўрапейскага культурнага жыцця, тут не паспелі сфарміравацца элементы раннебуржуазнага грамадства, толькі зараджалася свецкая літаратура, філасофская і грамадская думка працягвала арыентавацца на Біблію, не было выдатных дасягненняў у свецкіх відах мастацтва – жывапісу, скульптуры, музыкі. Тым не менш, рысы Рэнесанса назіраліся ў архітэктуры, графіке, асвеце і свецкіх відах мастацтва. Можна гаварыць аб шматграннасці і варыянтнасці рэнесанснай культуры на Беларусі.

Адукацыя, як і ў папярэдні перыяд, захоўвала рэлігійны характар. Пры праваслаўных цэрквах і манастырах існавалі школы, у іх праграму навучання ўваходзілі: царкоўна-славянская граматыка, матэматыка, філасофія, тэалогія. Разам з тым, пры праваслаўных брацтвах (гэта грамадскія аб’яднанні прыхажан) у Вільні, Магілёве, Слуцке, Бярэсце, Полацку і інш. дзейнічалі брацкія школы з больш шырокай праграмай, што ўключала вывучэнне замежных і класічных (лацінскай і грэчаскай) моў, гісторыю, рыторыку. Навучанне ў іх было галоўным чынам бясплатным.

Шырокая праграма адукацыі існавала ў пратэстанцкіх школах. Найбольш вядомыя – у Іўі, Вільне, Бярэсце, Слуцку. Пратэстанты выступілі з прапановай заснаваць у ВкЛ універсітэт, але ва ўмовах контррэфармацыі ідэю перахапілі езуіты, а пратэстанцкія школы наогул былі зачынены.

Асабліва хутка развівалася каталіцкая сістэма адукацыі ў XVI ст. згодна з пастановамі сінодаў, кожны прыход павіннен мець пачатковую школу. Акрамя таго, шматлікія каталіцкія манаскія ордэны адчынялі свае сярэднія навучальныя ўстановы – калегіўмы. Асабліва вядомымі былі езуіцкія і піярскія калегіўмы. Першы езуіцкі калегіўм быў заснаваны ў Вільне (1570 г.), на тэрыторыі Беларусі – у Полацку (1581 г.). Калегіўмы давалі класічную гуманітарную адукацыю. Навучанне было бясплатным, прымаліся юнакі любых саслоўяў і веравызнанняў, навучанне працягвалася 6 – 7 гадоў. Увесь навучальна-выхаваўчы працэс быў прасякнуты рэлігійнай накіраванасцю. У той жа час калегіўмы садзейнічалі ўсталяванню на Беларусі заходне-еўрапейскай сістэмы адукацыі. На базе Віленскага езуіцкага калегіўма ў 1579 г. была створана езуіцкая акадэмія – першая вышэйшая навучальная ўстанова ў ВкЛ. Першым яе рэктарам быў выдатны палеміст, дзеяч ордэна езуітаў – Петр Скарга.

Пашырэнне агульнага ўзроўня адукаванасці абумовіла ўзнікненне попыту на кнігі. У XIII – XVI стст. цэнтрамі перапіскі кніг з’яўляліся праваслаўныя манастыры (скрыпторыі ў Навагрудку, Полацку, Смаленску, Вільне, Віцебску, Лаўрышаве, Супрасле), дзяржаўная канцылярыя ў Вільне, канцылярыі буйных феадалаў. Ствараліся значныя кнігазборы – бібліятэкі. Найбольш вядомымі былі: бібліятэка Полацкага Сафійскага сабора; бібліятэкі манастыроў у Спраслі, Вільне, Слуцку, Пінску; а так сама кнігазборы навучальных устаноў (езуіцкіх калегіўмаў і акадэміі) і прыватныя зборы магнатаў (Раздзівілаў, Сапегаў).

Скрыпторыі не маглі задаволіць ўзрастаўшага попыту на кніжнае слова, таму не выпадкова, што ў ВкЛ узнікла кнігадрукаванне раней за ўсе ўсходнеславянскія землі. Заснавальнік усходнеславянскага кнігадрукавання – выдатны гуманіст і асветнік Францыск Скарына. У 1517-1519 гг. ён у Празе пераклаў і выдаў (з каментарыямі) Псалтыр і 22 кнігі Старога запавету Біблii. У 1522 г. ён пераехаў у Вільню, дзе заснаваў першую на тэрыторыі ўсходніх славя друкарню, з якой вышлі "Малая падарожная кніжыца" (1522 г.) і "Апостал" (1525 г.).

У 1550-я гг. у Бярэсці пачала працаваць пратэстанцкая друкарня Мікалая Радзівіла Чорнага – першая на Беларусі. Наогул, пратэстанцкія друкарні ў 1560 – 1570-я гг. дзейнічалі ў Нясвіжы, Вільне, Слуцку, Уздзе, Лоску, Іўе, Ашмянах. Сярод найбольш вядомых выданняў пратэстантаў – "Брэсцкая біблія" (1563 г.), "Нясвіжская біблія" (1572 г.), "Новы запавет" (1574 г.), "Размова паляка з літвінам" (1564 г.).

Першую кірылічную кнігу (на старажытнабеларускай мове) – Катэхізіс выдалі Сымон Будны і Лаўрэнці Крышкоўскі ў Нясвіжскай друкарні ў 1562 г., у той жа год С.Будны надрукаваў "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад богам", пазней – "Біблію" (1572 г.), "Новы Завет" (1574 г.), "Аб галоўных палажэннях хрысціянскай веры" (1576 г.).

У 1570-я гг. у маёнтку Цяпіна на Полаччыне заснаваў друкарню Васіль Цяпінскі. Ён выдаў "Евангелле" на царкоўна-славянскай мове з паралельным перакладам на беларускую мову. С.Будны і В.Цяпінскі выступалі ў абарону беларускай мовы, за развіццё на ёй пісьменнасці і кнігадрукавання.

Рускія першадрукары – Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец пасля выгнання з Масквы працавалі на Беларусі ў маёнтку Р.Хадкевіча Заблудава. Яны выдалі "Евангелле вучыцельнае" (1569 г.) і "Псалтыр з Часасловам" (1570 г.). У 1580-я гг. І.Фёдараў пераехаў у Астрогу, дзе выдаў "Астрожскую біблію" (1580-1581 гг.), а П.Мсціславец працаваў у друкарні братоў Мамонічаў у Вільні.

Напрыканцы XVI ст. у княстве дзейнічалі шматлікія друкарні – прыватныя, пры буйных праваслаўных брацтвах, пратэстанцкія, вельмі актыўную дзейнасць распачалі езуіцкія друкарні. Выдавалася самая розная літаратура на беларускай, польскай, лацінскай мовах – як багаслоўская, так і свецкая, у тым ліку, прававая. Так, ў 1588 г. у друкарне Мамонічаў у Вільне ўпершыню быў выдадзены свод законаў – Статут ВкЛ. Выдавецкая дзейнасць была цесна звязана з развіццём літаратуры.

Як і раней, працягвалі складацца рукапісныя Палеі, Пацерыкі, Пралогі, Мінеі – яны складаліся з твораў антычных і грэка-візантыйскіх аўтараў. У эпоху Адраджэння да іх дабавіліся пераклады заходнееўрапейскіх свецкіх раманаў – такіх як "Аповесць пра Баву", "Гісторыя пра Атылу", "Аповесць пра Трышчана", "Александрыя", "Троя", дыдактычныя навелы, зборнікі фацэцый (анекдатычных гісторый).

З XIV ст. з'явілася летапісанне ВкЛ. У летапісах абгрунтоўвалася неабходнасць стварэння ВкЛ, абаранялася цэнтралізатарская палітыка вялікіх князёў. Помнікі – "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх" (прыкладна 1396 г.), "Пахвала Вітаўту"(канец 1420-х гг.), "Беларуска-літоўскі летапіс" (1446 г.).

На змену летапісанню разам з Адраджэннем ў XVI ст. прыйшла гістарычная проза і мемуарыстыка: “Баркулабаўскі летапіс”, “Дзённік” Федара Еўлашоўскага, “Пхвала гетману Канстанціну Астрожскаму” (пасля 1514 г.), на беларускую мову перакладалі “Хроніку” М.Стрыйкоўскага, “Хроніку” М.Бельскага.

У 1516 г. была выдадзена паэма “Пруская вайна” Яна Вісліцкага (родам з Беларусі, “русін”) на лацінскай мове, у якой аўтар апісвае перамогу славянскіх народаў над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве. У 1523 г. у Рыме была выдадзена яшчэ адна паэма аўтара-беларуса Міколы Гусоўскага – “Песня пра зубра”, так сама на лацінскай мове. Гэта было пачаткам рэнесанснай лацінскамоўнай традыцыі ў беларускай паэзіі.

Заснавальнікам панегірычнай літаратуры (панегірык – хвалебная прамова) на Беларусі лічыцца Андрэй Рымша. Яго “Панегірык гербу Льва Сапегі” (1588 г.), а так сама панегірыкі гербам А.Валовіча, Ф.Скумны былі прыкладам для іншых аўтараў. У беларускай паэзіі з’явіліся жанры: дэкламацыя, вершаваныя прысвячэнні, сатырычная паэзія, паэтычныя “плачы”, “ляманты”, эпіграммы.

У сувязі с прыняццем Берасцейскай уніі 1596 г. шарокае распаўсюджанне атрымала палемічная літаратура. На старонках выданняў шлі інтэлектуальныя бітвы паміж прыхільнікамі ўніі (П.Скарга, І.Пацей) і прыхільнікамі праваслаўя і пратэстантызму (К.Філалет, М.Сматрыцкі, С.Будны, Канстанцін Астрожскі і інш.). К.Філалет у сваім творы “Апокрысіс” (1597 г.) абвінавачваў іерархаў-уніятаў у матэрыяльных выгадах уніі. Найбольшага росквіту палемічная літаратура атрымала ў першай палове XVII ст.

Развіцце музычнага мастацтва шло ў межах царкоўных устаноў. З канца XV ст. развіваецца кантавая культура спеваў, а ў другой палове XVI ст. – партэсныя спевы, спевакоў рыхтавалі ў брацкіх і манастырскіх школах.

У самым канцы XVI ст. пры каталіцкіх установах-кляштарах сталі ўтварацца капэлы – калектывы, якія складаліся з аркестра і групы вакалістаў. З будаўніцтвам новых каталіцкіх храмаў пачала пашыралася арганная музычная культура.

Е XIV – XVI стст. шырокую папулярнасць у народзе атрымаў лялечны тэатр – батлейка. Прадстаўленні даваліся пад час ярмарак, на рынках, запрашалі лялечнікаў і да двароў феадалаў.

**Архітэктура і будаўніцтва XIV – XVI стст.**

Галоўныя матэрыялы, што выкарыстоўваліся ў будаўніцтве ў тыя часы – дрэва. Гэты матэрыял не спрыяў захаванню пабудоў. Таму мы больш ведаем пра мураваныя збудаванні, якіх будавалі нешмат, але якія лепей захаваліся. У XIV – пачатку XVI стст. асноўны тып манументальных мураваных пабудоў – гэта замак. Менавіта ў XIV ст. з’явіліся цалкам мураваныя замкі-кастэлі, квадратныя ў плане з башняй-данжонам (Крэва, Ліда, Трокі, Меднікі).

У першай палове XVI ст. сфарміраваўся самабытны 4-х вежавы тып праваслаўнага храма з абарончай функцыяй (Мураванкаўская, Сынкавіцкая, Супрасльская цэрквы-крэпасці, Мікалаеўскі сабор у Брэсце). Іх стыль вызначаецца як “беларуская готыка”. Актыўна будаваліся каталіцкія гатычныя храмы – з аднанефавымі, аднаапсіднымі аб’ёмна-прасторавымі кампазіцыямі (касцёлы ў Ішкальдзі, Іўі). З рэфармацыяй з’явіліся новыя культавыя пабудовы –

зборы, якія спалучалі гатычныя рысы ў форме пабудовы і рэнесансавы ордэрны дэкор (зборы ў Койданаве, Заслаўі, Замосці, Новым Свержані).

Езуіты прынеслі на Беларусь новы архітэктурны стыль – барока. Першы ўзор архітэктуры барокка на тэрыторыі Рэчы Паспалітай – гэта Нясвіжскі езуіцкі касцёл, які ў 1587-1593 гг. будаваў выдатны архітэктар Джаванні Бернардоні. Для барока характэрны пабудовы ў форме базілікі з плоскім фасадам. Пабудовы вызначаліся плаўнасцю ліній і багатым знешнім і ўнутраным дэкорам.

Са змяненнем стыляў у будаўніцтве і ўвядзеннем новых прынцыпаў фартыфікацыі прыватныя замкі пачалі трансфармавацца ў палацава-замкавыя комплексы (Нясвіж, Гродна, Гальшаны). Акрамя іх будаваліся палацы з кампактнай цэнтральна-восевай планіроўкай без унутранага двара (дом-крэпасць у Гайцюнішках, Ружанскі замак).

З пашырэннем магдэбурскага права ў гарадах узнікла грамадзянская архітэктура – ратушы, дзе месціліся органы самакіравання (Нясвіж, другая палова XVI ст.).

У межах ВкЛ развіваліся ўсе віды выяўленчага мастацтва. На жаль, прыкладаў манументальнага мастацтва (роспісы храмаў) не захавалася, аб высокай ступені яе развіцця гаварацЬ пісьмовыя крыніцы.

Раннія творы іканапісу ў XIV – XV стст. мелі вялікі ўплыў візантыйскіх узораў. Асноўныя прыкметы – дыспрапорцыя, пласкастное выяўленне, адсутнасць перспектывы. У другой палове XVI ст. у іконапісанні адчуваюцца рысы Адраджэння – з'яўляюцца элементы бытавога характару, архітэктурныя кулісы, прасторавасць пабудовы. У пачатку XVI ст. складваецца беларуская іканапісная школа. Найболь папулярны сюжэт у іконапісе – выявы Маці Боскай Адзігітрыі (Багародзіцы).

У свецкім жывапісе вылучаецца некалькі накірункаў. Партрэты-іконы характэрны для XIV ст., як прыклад – партрэт-ікона Ефрасінні Полацкай. Выканаы такія партрэты з улікам канонаў іконапісання.

На партрэтах-парсунах ужо больш аб'ёмнае прадстаўленне чалавека, з'яўляюцца элементы перспектывы і рэалізму. Невядомымі мастакамі створаны цікавыя партрэты княгіні Кацярыны Слуцкай (1580 г.), князя Юрыя Алелькавіча, Юрыя Тышкевіча (усе – канец XVI ст.). Перыяду Адраджэння на Беларусі характэрны сармацкі партрэт, з уласцівай яму ўрачыстасцю і параднасцю, увагай да атрыбутаў і гербаў, фактуры прадметаў і дэталяў адзення.

З развіццём кнігадрукавання далейшае развіццё атрымала кніжная графіка. Рукапісныя кнігі аздабляліся мініяцюрамі, друкаваныя – гравюрамі. Заснавальнікам кніжнай гравюры на Беларусі стаў Францыск Скарына. Яго выданні (Біблія, Псалтыр, Малая падарожная кніжыца) былі багата ілюстраваны сюжэтнымі кампазіцыямі і ілюстрацыямі прыкладнога характару, арнаментам.

З пашырэннем на Беларусі каталіцтва звязана паяўленне скульптуры. Самы ранні помнік драўлянай скульптуры, што захаваўся да нашага часу – "Распяцце" з в.Галубічы Глыбоцкага раёна (XIV ст.). У XV – XVI стст. у касцелах з'яўляюцца гатычныя алтары-рэтаблі, з якіх захаваліся толькі асобныя скульптуры. Вялікі ўплыў Рэнесансу наглядаецца ў скульптуры полацкіх майстроў "Святы Гжэгаж" – яе выразнасць набліжаецца да партрэтнай. Наогул, да скульптуры XVI ст.

характэрна дасканалая апрацоўка форм чалавечай фігуры, увага да побытавых дэталяў. З'явіўся новы тып скульптуры – надмагіллі (Віленскі кафедральны сабор, надмагіллі канцлера А.Гаштольда і біскупа П.Гальшанскага, абодва – сярэдзіна XVI ст.).

У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве вядучымі галінамі заставалася мастацкая апрацоўка металаў і вытворчасць ювелірных вырабаў. У гатычнай традыцыі зроблены пацір з Ружан (канец XV ст.), абклад Лаўрышаўскага евангелля (пачатак XV ст.). Уплыў Рэнесансу бачны ў паціру з Навагрудка (XVI ст.). Мясцовыя майстры арганічна спалучалі традыцыі ранейшых часоў і асаблівасці заходнееўрапейскага мастацтва. Архітэктура і будаўніцтва

Галоўныя матэрыялы, што выкарыстоўваліся ў будаўніцтве ў тыя часы – дрэва. Гэты матэрыял не спрыяў захаванню пабудоў. Таму мы больш ведаем пра мураваныя збудаванні, якіх будавалі нешмат, але якія лепей захаваліся. У XIV – пачатку XVI стст. асноўны тып манументальных мураваных пабудоў – гэта замак. Менавіта ў XIV ст. з'явіліся цалкам мураваныя замкі-кастэлі, квадратныя ў плане з башняй-данжонам (Крэва, Ліда, Трокі, Меднікі).

У першай палове XVI ст. сфарміраваўся самабытны 4-х вежавы тып праваслаўнага храма з абарончай функцыяй (Мураванкаўская, Сынкавіцкая, Супрасльская цэрквы-крэпасці, Мікалаеўскі сабор у Брэсце). Іх стыль вызначаецца як "беларуская готыка". Актыўна будаваліся каталіцкія гатычныя храмы – з аднанефавымі, аднаапсіднымі аб'ёмна-пpасторавымі кампазіцыямі (касцёлы ў Ішкальдзі, Іўі). З рэфармацыяй з'явіліся новыя культавыя пабудовы – зборы, якія спалучалі гатычныя рысы ў форме пабудовы і рэнесансавы ордэрны дэкор (зборы ў Койданаве, Заслаўі, Замосці, Новым Свержані).

Езуіты прынеслі на Беларусь новы архітэктурны стыль – барока. Першы ўзор архітэктуры барокка на тэрыторыі Рэчы Паспалітай – гэта Нясвіжскі езуіцкі касцёл, які ў 1587-1593 гг. будаваў выдатны архітэктар Джаванні Бернардоні. Для барока характэрны пабудовы ў форме базілікі з плоскім фасадам. Пабудовы вызначаліся плаўнасцю ліній і багатым знешнім і ўнутраным дэкорам.

Са змяненнем стыляў у будаўніцтве і ўвядзеннем новых прынцыпаў фартыфікацыі прыватныя замкі пачалі трансфармавацца ў палацава-замкавыя комплексы (Нясвіж, Гродна, Гальшаны). Акрамя іх будаваліся палацы з кампактнай цэнтральна-восевай планіроўкай без унутранага двара (дом-крэпасць у Гайцюнішках, Ружанскі замак).

З пашырэннем магдэбурскага права ў гарадах узнікла грамадзянская архітэктура – ратушы, дзе месціліся органы самакіравання (Нясвіж, другая палова XVI ст.).

У межах ВкЛ развіваліся ўсе віды выяўленчага мастацтва. На жаль, прыкладаў манументальнага мастацтва (роспісы храмаў) не захавалася, аб высокай ступені яе развіцця гаварацць пісьмовыя крыніцы.

Раннія творы іканапісу ў XIV – XV стст. мелі вялікі ўплыў візантыйскіх узораў. Асноўныя прыкметы – дыспрапорцыя, пласкастное выяўленне, адсутнасць перспектывы. У другой палове XVI ст. у іконапісанні адчуваюцца рысы Адраджэння – з'яўляюцца элементы бытавога характару, архітэктурныя кулісы, прасторавасць пабудовы. У пачатку XVI ст. складваецца беларуская іканапісная

школа. Найболь папулярны сюжэт у іконапісе – выявы Маці Боскай Адзігітрыі (Багародзіцы).

У свецкім жывапісе вылучаецца некалькі накірункаў. Партрэты-іконы характэрны для XIV ст., як прыклад – партрэт-ікона Ефрасінні Полацкай. Выкананы такія партрэты з улікам канонаў іконапісання.

На партрэтах-парсунах ужо больш аб'ёмнае прадстаўленне чалавека, з'яўляюцца элементы перспектывы і рэалізму. Невядомымі мастакамі створаны цікавыя партрэты княгіні Кацярыны Слуцкай (1580 г.), князя Юрыя Алелькавіча, Юрыя Тышкевіча (усе – канец XVI ст.). Перыяду Адраджэння на Беларусі характэрны сармацкі партрэт, з уласцівай яму ўрачыстасцю і параднасцю, увагай да атрыбутаў і гербаў, фактуры прадметаў і дэталяў адзення.

З развіццём кнігадрукавання далейшае развіццё атрымала кніжная графіка. Рукапісныя кнігі аздабляліся мініяцюрамі, друкаваныя – гравюрамі. Заснавальнікам кніжнай гравюры на Беларусі стаў Францыск Скарына. Яго выданні (Біблія, Псалтыр, Малая падарожная кніжыца) былі багата ілюстраваны сюжэтнымі кампазіцыямі і ілюстрацыямі прыкладнога характару, арнаментам.

З пашырэннем на Беларусі каталіцтва звязана паяўленне скульптуры. Самы ранні помнік драўлянай скульптуры, што захаваўся да нашага часу – "Распяцце" з в.Галубічы Глыбоцкага раёна (XIV ст.). У XV – XVI стст. у касцелах з'яўляюцца гатычныя алтары-рэтаблі, з якіх захаваліся толькі асобныя скульптуры. Вялікі ўплыў Рэнесансу наглядаецца ў скульптуры полацкіх майстроў "Святы Гжэгаж" – яе выразнасць набліжаецца да партрэтнай. Наогул, да скульптуры XVI ст. характэрна дасканалая апрацоўка форм чалавечай фігуры, увага да побытавых дэталяў. З'явіўся новы тып скульптуры – надмагіллі (Віленскі кафедральны сабор, надмагіллі канцлера А.Гаштольда і біскупа П.Гальшанскага, абодва – сярэдзіна XVI ст.).

У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве вядучымі галінамі заставалася мастацкая апрацоўка металаў і вытворчасць ювелірных вырабаў. У гатычнай традыцыі зроблены пацір з Ружан (канец XV ст.), абклад Лаўрышаўскага евангелля (пачатак XV ст.). Уплыў Рэнесансу бачны ў пацiру з Наваградка (XVI ст.). Мясцовыя майстры арганічна спалучалі традыцыі ранейшых часоў і асаблівасці заходнееўрапейскага мастацтва.

**Культура Беларусі ў другой палове XX стагоддзя**

За гады 2-й сусветнай вайны была знішчана амаль уся матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў навукі і культуры, не прыйшлі з вайны многія адукаваныя і прафесійна падрыхтаваныя людзі. У такіх умовах адразу пасля вызвалення пачынаецца культурнае аднаўленне БССР.

Але першыя пасляваенныя гады адзначыліся новай хваляй шырокамаштабных рэпрэсій на Беларусі, звязаных з дзейнасцю паплечніка Берыі Я.Цанавы. На 25 год лагероў была асуджана Ларыса Геніюш. Зноў арыштаваны пісьменнікі А.Александровіч, Б.Мікуліч, А.Пальчэўскі, С.Грахоўскі, С.Шушкевіч, А.Звонак і інш. У аснову кампаніі супраць інтэлігенцыі была пакладзена пастанова ЦК ВКП(б) Аб часопісах "Звязда" і "Ленінград" (1946) і інш. Для актывізацыі барацьбы з "нацыяналізмам" і "касмапалітызмам" у БССР быў

прысланы прадстаўнік ЦК кампартыі М.Гусараў. Крытыкаваліся як асобныя творцы (М.Танк, К.Буйло), так і цэлыя выданні. У скажэнні жыцця беларускай вёскі быў абвінавачаны і зняты з пасады рэдактара часопіса “Маладосць” аўтар аповесці “Дабрасельцы” А.Кулакоўскі. Наступленне накіроўвалася і на дзеячаў беларускай навукі. Ад яго пацярпелі прэзідэнт АН БССР А.Жэбрак (1947), славуты генетык, які не падтрымліваў лысенкаўскія метады ў біялогіі; наркам асветы П.Саевіч (1951), абвінавачаны ў “югаслаўскім шпіянажы”. Ішоў працэс падпарадкавання партыі ўсіх сфер жыцця. Рэальную ўладу ўтрымлівалі партыйныя камітэты. Узмацняліся русіфікатарскія тэндэнцыі ў палітыцы цэнтральных органаў улады, гэтаму спрыяла дзейнасць на Беларусі прысланых з Масквы партыйных і савецкіх работнікаў, асабліва пасля дыскусіі па мовазнаўстве ў 1950 г.

Але адбывалася аднаўленне сістэмы адукацыі. Да 1950 г. ўдалося аднавіць даваенную сетку агульнаадукацыйных школ, ішло павелічэнне колькасці сярэдніх школ. Да сярэдзіны 50-х гг. быў завершаны пераход да ўсеагульнага сямігадовага навучання. У 1944-1945 гг. працавалі 22 ВНУ. Хутка адраджалася акадэмічная навука, флагманам якой стала аднавіўшая сваю работу ў 1944 г. АН БССР. К канцу 1950 г. ў рэспубліцы дзейнічала 77 навуковых устаноў.

Развіццё беларускай літаратуры ішло ў вельмі складаных умовах. Дыктат камуністычнай партыі, перавага стылю “сацыялістычнага рэалізму” прывёў да таго, што многія літаратурныя творы вызначаліся бесканфліктнасцю і ідэалізацыяй савецкага ладу (раманы А.Стаховіча, М.Паслядовіча і інш.). Галоўная тэма беларускай літаратуры – гэта вайна (І.Мележ, М.Лынькоў, І.Шамякін і інш). Гэтаму ж былі прысвечаны і першыя пасляваенныя п’есы К.Крапівы, А.Маўзона, А.Кучара.

Тэатральнае мастацтва таксама адчувала на сабе ўціск партыйнага кіраўніцтва. Калі ў сезоне 1944-45 гг. у БССР працавала 12 тэатраў, то ў 1950 г. іх засталося толькі 8. У касмапалітызме былі абвінавачаны тэатральныя рэжысёры В.Галаўчынер, Я.Рамановіч. Пачаліся нападкі на п’есы А.Макаёнка, оперу Я.Цікоцкага “Алеся”, кампазітара П.Падкавырава. У той жа час на сцэне ззялі таленты актораў Б.Платонава, Г.Глебава, Л.Ржэцкай, Л.Аляксандроўскай.

Адной з галоўных тэм мастацтва становіцца гераізм савецкіх людзей у гады вайны, увасабленне героя з багатым унутраным светам. Героіку савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны ўвасабляюць мастакі Я.Ціхановіч, І.Давідовіч, Я.Зайцаў, В.Волкаў. З пачатку 50-х гадоў пачынаюць набываць папулярнасць жанравыя карціны (Г.Бржазоўскі, А. і І.Ткачовы, П.Гаўрыленка). Ярка праявіўся талент скульптара З.Азгура. Ён стварае цэлую серыю партрэтаў гістарычных дзеячаў і герояў сучаснасці. Значным дасягненнем стаў ансамбль Плошчы Перамогі (1954), створаны З.Азгурам, А.Бембелем, А.Глебавым, С.Селіханавым.

Манументалізмам адзначаецца і пасляваенная архітэктура (кампазіцыі праспекта Скарыны, Прывакзальнай плошчы). Пануе так званы імперскі стыль – “сталінскі ампір”. Ствараюцца генпланы рэканструкцыі гарадоў. Значная ўвага надаецца аднаўленню прамысловых прадпрыемстваў і жылога фонду (пераважна малапавярховыя дамы). Такім чынам, асаблівасцю пасляваеннага развіцця культуры стаў партыйны дыктат, барацьба з прагрэсіўнай інтэлігенцыяй,

русіфікацыя. Але важна адзначыць, што адбылося аднаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы адукацыі, навукі і культуры.

Супярэчлівы характар насіла культурнае жыццё рэспублікі і ў далейшы перыяд: 50-80 гады XX ст. З аднаго боку, ішла дэмакратызацыя, звязаная з наступленнем "адлігі", рэабілітацыя дзеячаў навукі і культуры, аслабленне партыйнага ўціску, а з другога, – русіфікацыя ўсіх сфер жыцця, абгрунтаваная тэзісам аб пабудове камуністычнага грамадства, дзе будуць зліты мовы і культуры ўсіх савецкіх народаў, ваяўнічы атэізм, шаблоннасць. У адукацыі ў гэты час праходзіць некалькі рэформ. У 1958 г. адбываецца пераход да ўсеагульнага 8-гадовага навучання і ўвядзенне ў сярэдняй школе адзінаццацігадовага тэрміну з вытворчым навучаннем. Дзесяцігадовае навучанне вярнулася ў 1964-1984 гг., а ў 70-я гг. была ўведзена ўсеагульная сярэдняя адукацыя моладзі. У прафесійна-тэхнічнай адукацыі стваралася адзіная сістэма гарадскіх і сельскіх прафесійна-тэхнічных вучылішчаў. У 1950 г. ў БССР працавала больш за сто тэхнікумаў, 29 ВНУ. Але вышэйшая і сярэдняя спецыяльная адукацыя адзначалася экстэнсіўнасцю, калі пры пастаянным павелічэнні колькасці выпускнікоў не заўсёды захоўвалася якасць іх навучання.

Адной з адмоўных рыс адукацыі таго часу стала звужэнне сферы выкарыстання беларускай мовы. У БССР не было ніводнай сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай навучальнай установы з беларускай мовай навучання. Бацькі атрымалі права вызваляць дзяцей ад вывучэння беларускай мовы ў школе. Дапускалася выкладанне беларускай мовы па-руску. У сярэдзіне 80-х гг. усяго каля 19% дзіцячых садкоў і 23% школ працавалі на беларускай мове. У выніку такой моўнай палітыкі стварыліся вельмі неспрыяльныя ўмовы для развіцця беларускай культуры.

Навука гэтага перыяду характарызуецца станаўленнем фундаментальных даследаванняў. У сістэме АН БССР адкрываюцца інстытуты фізікі і матэматыкі, генетыкі, цепла- і масаабмену і інш. Ствараюцца цэлыя навуковыя школы (у галіне звычайных дыфферэнцыяльных ураўненняў — школа Н.П.Яругіна, спектраскапіі і лазераў – Б.І.Сцяпанава, цепла- і масапераносу – А.В.Лыкава, тэарэтычнай фізікі – Ф.І.Фёдарава, антрапагенэзу – Г.І.Гарэцкага, кардыялогіі – Г.І.Сідарэнкі, вылічальнай матэматыкі – У.І.Крылова, геалогіі і тэктонікі – Р.Г.Гарэцкага). Шырока вядомымі ў свеце сталі біёлаг В.Купрэвіч, матэматык У.Платонаў, фізік М.Барысевіч. Пераважнае развіццё ў рэспубліцы атрымалі тэхнічная і фізіка-матэматычная навукі, што звязана з развіццём навукова-тэхнічнага прагрэсу. Аднак толькі нямногія навуковыя распрацоўкі знаходзілі прымяненне на практыцы.

У беларускім рэчышчы развіваецца літаратура. Узмацняецца яе сувязь з жыццём. Але захоўваецца партыйнае кіраўніцтва, цэнзура, асабліва пашыраныя ў другой палове 60-х гг. У якасці вядучага жанру прозы ўсталёўваецца раман. Галоўнай застаецца тэма мінулай вайны, але зараз мастакі слова большую ўвагу надаюць раскрыццю ўнутранага свету чалавека ў такіх экстрэмальных умовах (раманы А.Адамовіча, В.Быкава, І.Навуменкі, І.Чыгрынава, дакументалістыка С.Алексіевіч і інш.). Гістарычная праблематыка таксама прыцягвае да сябе

пільную ўвагу (раманы Л.Дайнекі, В.Іпатавай, У.Караткевіча, К.Тарасава, п’есы А.Макаёнка, А.Петрашкевіча).

Шмат твораў прысвячалася праблемам сацыялістычнай рэчаіснасці (Я.Брыль, Г.Далідовіч, К.Крапіва, І.Мележ, І.Шамякін). Паэзія адзначана творамі Р.Барадуліна, П.Броўкі, Н.Гілевіча, П.Глебкі, П.Панчанкі і інш. Беларускія літаратары цесна супрацоўнічалі з кінастудыяй “Беларусьфільм”, якая аднавіла сваю работу ў 1944 г. Кожны год на ёй выпускалася каля 70 фільмаў розных накірункаў. Сярод найбольш вядомых – мастацкія стужкі “Міколка-паравоз”, “Белыя росы”, “Крушэнне імперыі”, “Альпійская балада”.

З 60-х гг. беларускія тэатры захапляюцца маральна-этычнай праблематыкай. Ставяцца п’есы беларускіх драматургаў (А.Дударава, А.Макаёнка, М.Матукоўскага), рускіх і сусветных класікаў, савецкіх аўтараў. Сусветнае прызнанне атрымлівае балетная трупа Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета пад кіраўніцтвам В.Елізар’ева, свайго роду заснавальніка беларускай школы балета ("Стварэнне свету" А.Пятрова і інш.). К сярэдзіне 80-х гг. у БССР працавалі 2 музычныя, 6 лялечных, 9 драматычных тэатраў, але толькі тры з іх былі беларускамоўныя.

У музычным мастацтве развіваюцца жанры сімфоніі і інструментальнай музыкі (кампазітары У.Алоўнікаў, М.Аладаў, А.Багатыроў, І.Лучанок, У.Мулявін, П.Падкавыраў, Я.Цікоцкі). Наладжваецца цеснае супрацоўніцтва з тэатрамі (оперы М.Аладава, Дз.Лукаса, Р.Пукста, Дз.Смольскага, Ю.Семянякі). Кампазітары звяртаюцца да ваенна-патрыятычнай тэматыкі, увасаблення вобразаў рэальных гістарычных асоб. Большасць кампазітараў працуе ў розных жанрах. У 70-80-я гг. з’яўляюцца новыя тыпы музычных і танцавальных калектываў (вакальна-інструментальныя ансамблі “Песняры”, “Верасы”, “Сябры”, фальклорна-харэаграфічны ансамбль “Харошкі”).

Дзяржава садзейнічае масаваму развіццю самадзейнай мастацкай творчасці: многія аматарскія калектывы сталі вядомы далёка за межамі рэспублікі. У 1983-1985 гг. у БССР было створана 652 калектывы мастацкай самадзейнасці, якія аб’ядноўвалі 18 тысяч удзельнікаў.

У гады “адлігі” пачалі сваю працу таленавітыя мастакі А.Кішчанка, Я.Шчамялёў, Г.Вашчанка, У.Стальмашонак, М.Савіцкі. Пашыраецца так званы “суровы стыль”, які праўдзіва адлюстроўвае жыццё (М.Савіцкі — цыкл “Лічбы на сэрцы” і інш. работы). Пераважае ваенная (М.Данцыг, В.Грамыка) і гістарычная (А.Марачкін, Я.Шчамялёў) тэматыка. Ствараюцца цэлыя серыі партрэтаў знакамітых людзей Беларусі (З.Паўлоўскі, У.Стальмашонак, І.Ахрэмчык, В.Сахненка). У 50-60 гг. набывае папулярнасць новы жанр гарадскога пейзажа (П.Масленікаў, М.Данцыг), развіваецца нацюрморт (В.Жалток, Я.Радзялоўская, С.Каткова). Але некаторыя мастакі, нязгодныя з стэрэатыпнасцю ў жывапісе, вымушаны былі пакінуць краіну і набылі шырокую вядомасць за яе межамі (В.Баброў, А.Ісачоў, Н.Паўлоўскі, г.Хацкевіч). У выяўленчым мастацтве замацавалася сістэма творчых заказаў, што, безумоўна, зніжала ўзровень мастацкіх твораў. Беларуская графіка гэтага часу прадстаўлена серыямі па гісторыі і сучаснасці, з выкарыстаннем розных прыёмаў (работы У.Басалыгі, С.Геруса, В.Шаранговіча).

Значныя змены адбываюцца ў гэты час у архітэктуры. Пачынаецца масавае будаўніцтва жылля; распрацоўваюцца генпланы забудовы гарадоў, у якіх плануецца месца пад цэлыя жылыя раёны і мікрараёны. Распаўсюджваецца буйнапанэльнае будаўніцтва. Хуткія тэмпы, імкненне да зніжэння кошту жылля прывялі да тыпізацыі забудовы; гарады страцілі сваё адметнае аблічча. У 70-я гг. паступова пераадольваецца жорсткі рацыяналізм, выкарыстоўваюцца новыя праекты на аснове блок-секцыйных метадаў. Знешні выгляд гарадоў вызначаюць буйныя прамысловыя комплексы. Новым аб’ектам для беларускіх будаўнікоў становіцца сталічны метрапалітэн (з 1977 г.). Архітэктары працуюць над стварэннем мемарыяльных ансамбляў і комплексаў (манумент “Мінск — горад-герой”, комплексы “Хатынь”, “Брэсцкая крэпасць-герой”, “Прарыў”).

У той жа час у сярэдзіне 50-х гг. узмацнілася палітыка канфрантацыі дзяржавы ў адносінах да рэлігіі і вернікаў, што звязана з ідэяй пабудовы на працягу аднаго пакалення ў краіне камунізму, дзе рэлігіі няма месца. Пасля пастановы СМ СССР (1961 г.) пачалася кампанія па масавым закрыцці і нават знішчэнні храмаў, рэпрэсіі ў адносінах да служыцеляў культаў.

Культура БССР сярэдзіны 50-80 гг. была цесна звязана з культурамі саюзных рэспублік і краін сацыялістычнага лагера. Ладзіліся тыдні і дэкады культуры Беларусі ў іншых краінах, фестывалі мастацтваў (“Дружба народаў”, “Беларуская музычная восень” і інш.), на гастролі выязджалі славутыя беларускія творцы, умацоўваліся сувязі творчых саюзаў і мастацкіх калектываў.

Неад’емнай часткай агульнай беларускай культуры з'яўляецца культура беларускага замежжа. Далёка ад радзімы працуюць таленавітыя навукоўцы і творцы: нобелеўскі лаўрэат, вучоны І.Прыгожын, літаратары Н.Арсеннева, М.Сяднёў, М.Галіна (родны брат Я.Коласа), У.Дудзіцкі, Р.Жук-Грышкевіч, архітэктар і мастак М.Навумовіч, гісторыкі Я.Запруднік, В.Жук-Грышкевіч, літаратуразнаўца З.Кіпель, дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку В.Кіпель і многія іншыя.

Такім чынам, беларуская культура перыяду 40-80 гг. прайшла вельмі складаны і цяжкі шлях праз празмернае партыйна-савецкае кіраўніцтва, класавы падыход. Абмяжоўвалася свабода творчасці, і, што найбольш цяжка для нацыянальнай культуры, выцісканне беларускай мовы было ўведзена ў ранг дзяржаўнай палітыкі. Культура, навука і адукацыя не атрымлівалі дастатковага фінансавання, што сур’ёзна адбілася на іх узроўні і якасці. У той жа час увесь свет ведае нашых навукоўцаў, літаратараў, мастакоў, акцёраў, што сведчыць аб глыбіні і высокім прафесійным узроўні культуры.

## ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## Планы практычных заняткаў

**Тэма 1. Архітэктура беларускіх зямель ў X - XIII стст.**

1. Асаблівасці полацкай архітэктурнай школы.
2. Полацкі Сафійскі сабор.
3. Спаса-Прэабражэнскі сабор ў Полацку.
4. Пятніцкая царква Барысаглебскага манастыра.
5. Асаблівасці гродзенскай архітэктурнай школы.
6. Царква Барыса і Глеба ў Гродна.
7. Ніжняя царква ў Гродна.

**Тэма 2. Пісьменнасць усходніх славян ў X - XIII ст.**

1. Помнікі эпіграфікі на беларусі X - XIII ст.
2. Пісьменнасці ўсходніх славян. Алфавіт.
3. Перакладная літаратура X - XIII ст.
4. Кананічныя творы, патрыстыка, агіяграфія, пацерык.
5. Тураўскае і Аршанскае евангеліе.

**Тэма 3. Культура Беларусі ў XIV- першай палове XVII стст: архітэктура і горадабудаўніцтва.**

1. Архітэктурныя помнікі эпохі ранняга борока на Беларусі.
2. Храмы абарончага тыпу: касцёлы ў Ішкаладзі, Камаях і Вселюбах.
3. Цэрквы-крэпасці ў Сынковічах, Мураванцы і Супраслі.
4. Замкі-кастэлі: Ліда, Крэва, Меднікі, Геранёны і Ляхавічы..
5. Замак ў Міры – унікальны помнік айчыннага дойлідства.

**Тэма 4. Культура Беларусі ў XIV – першай палове XVII стст.: мастацтва, літаратура, адукацыя.**

1. Кнігадрукаванне як рамяство.
2. Пражскія і віленскія выданні Скарыны.
3. Гравюры выданняў Скарыны.
4. Пратэстанскія кнігадрукары.
5. Прыватныя і брацкія друкарні.

**Тэма 5. Літаратура на Беларусі ў XIV – першай палавіне XVII стст.**

1. Барочная літаратурная традыцыя на Беларусі ў канцы XVI – першай палове XVII ст.
2. Семяон Полацкі.
3. Гералідычная і панегерычная літаратура на Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.

**Тэма 6. Культура Беларусі ў другой палове XVII – XVIII стст.: архітэктура і мастацтва**

1. Позняе (віленскае) барока і яго адметнасць.
2. Фарны касцёл ў Гродна.
3. Магілёўская школа дойлідства.
4. Драўлянае дойлідства ў другой палове XVII – XVIII ст.

**Тэма 7. Развіццё станкавага і манументальнага жывапісу на Беларусі ў XVII – XVIII стст.**

1. Роспісы праваслаўных і уніяцкіх цэркваў ў Магілёве, Мсціславе і Віцебску.
2. Фрэскі касцёлаў св. Станіслава ў Магілёве, Божага цела ў Нясвіжы.
3. Уздым беларускай школы жывапісу ў XVII - XVIII ст.
4. Магілёўская гравёрная школа: Максім і Васіль Вошчанкі.
5. Кніжная гравюра XVII - XVIII ст.

**Тэма 8. Культура Беларусі ў другой палове XVII – XVIII стст.: літаратура, тэатр, музыка і адукацыя**

1. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры і мастацтве Беларусі другой паловы XVII - XVIII ст.

2 . Творы Андрэя Белабоцкага, К. Марашэўскага.

3. Развіццё навуковых ведаў на Беларусі: батаніка, медыцына, астраномія, матэматыка, філасофія, геаграфія.

4. Марцін Пачобут-Адляніцкі і віленская абсерваторыя.

**Тэма 9. Культура Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст.: архітэктура**

1. Горадабудаўніцтва.
2. Грамадзянская архітэктура.
3. Культавае дойлідства.
4. Ваеннае будаўніцтва.
5. Палацава-парковыя комплексы. Класіцызм.

**Тэма 10. Культура Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст.: мастацтва**

1. Выяўленчае мастацтва: жывапіс і графіка. Жанры. Мастацкія стылі.
2. Скульптура.

**Тэма 11. Культура Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст.: музычна-тэатральнае мастацтва**

1 Музычнае мастацтва.

2 Тэатральнае мастацтва.

**Тэма 12. Развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.: выяўленчае мастацтва**

1 Развіцце жывапісу (жанры, стылі, творчасць мастакоў).

2 Графіка.
3. Скульптура

**Тэма 13. Культура Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе**
1. Архітэктура і горадабудаўніцтва.
2. Жывапіс.
3. Літаратура.
4. Тэатр і музыка.
5. Адукацыя і навука.

**Тэма 14. Айчынная культура ў другой палове 50-х — першай палове 80-х гг. ХХ ст.: архітэктура і выяўленчае мастацтва**
1. Горадабудаўніцтва і архітэктура.
2. Жывапіс. Мазаіка. Графіка.
3. Скульптура.

**Тэма 15. Айчынная культура ў другой палове 50-х — першай палове 80-х гг. ХХ ст.: літаратура, музыка, тэатр і кіно**
1 Літаратура.
2 Тэатр.
3 Музыка.
4 Кінамастацтва і анімацыя.

**Тэма 16. Беларуская культура на сучасным этапе: архітэктура, выяўленчае мастацтва, музыка і тэатр.**
1. Новыя рысы ў горадабудаўніцтве, архітэктуры, выяўленчым мастацтве.
2. Тэатральнае і музычнае жыццё, развіцце кінематографу і анімацыі
3. Тэатральныя, музычныя і кінафестывалі.

**Тэма 17. Беларуская культура на сучасным этапе: літаратура**
1. Публіцыстыка.
2. Гістарычная тэматыка.
3. Паэзія.
4. Драматургія.

# РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## Пытанні да заліку па гісторыі культуры Беларусі

1. Гісторыя культуры Беларусі як навука.
2. Крыніцы і гістарыяграфія.
3. Значэнне вывучэння гістрорыі культуры Бкларусі ў выхаваўчай рабоце.
4. Матэрыяльная культура беларускіх зямель у эпоху прешабытнага мастацтва.
5. Дахрысціянскія вераванні.
6. Вусна-паэтычная творчасць у IX-XIII стст.
7. Архітэктура.
8. Выяўленчае і дэкаратыўна прыкладное мастацтва.
9. Пісьменства.
10. Літаратура
11. Архітэктура і горадабудаўніцтва ў Беларусі XIV- першай палове XVII ст.
12. Выяўленчае мастацтва.
13. Рукапісная кніга. Кнігазборы. Кнігадрукаванне.
14. Літаратура.
15. Тэатр і музыка.
16. Адукацыя.
17. Архітэктура і мастацтва Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.
18. Літаратура і грамадска-плітычная думка.
19. Навука.
20. Тэатр і музыка.
21. Адукацыя.
22. Архітэктура і мастацтва Беларусі ў канцы XVIII першай палове XIX ст.
23. Літаратура.
24. Музычнае і тэатральнае мастацтва.
25. Адукацыя і асвета.
26. Навука.
27. Архітэктура і выяўленчае мастацтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.
28. Літаратура.
29. Театральнае і музычнае мастацтва.
30. Адукацыя.
31. Навука.
32. Культура Беларусі ў 20-30–ыя гг. XX ст.
33. Культура Заходняй Беларусі.
34. Культура Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.
35. Айчынная культура ў другой палове 50-х першай палове 80-х гг. XX ст.

36. Беларуская культура на сучасным этапе. Нацыянальна- культурнае адраджэнне.

37. Сучасная літаратура

38. Драматургія, тэатральнае і музычнае жыццё.

## Тэмы рэфератаў

Тэма 4. Культура Беларусі ў IX – XIII стст.: літаратура

1. Перакладная літаратура.
2. Кананічныя творы, патрыстыка, агіяграфія, пацерыкі і інш.
3. Арыгінальная літаратура.
4. Жыцці Ефрасінні Полацкай і Аўраамія Смаляціча.
5. Аратарская проза.
6. Асоба і творчасць Кірылы Тураўскага.
7. Клімент Смаляціч.
8. «Слова пра паход Ігаравы» і беларускія землі.
9. Праблема летапісання ў Полацку і іншых гарадах Беларусі.
10. Іпацьеўскі летапіс.

Тэма 8. Айчынная культура ў другой палове XVII - XVIII стст.: літаратура, тэатр і музыка, адукацыя

1. Грамадска палітычная думка.
2. Паэзія С. Полацкага, яго ўклад у культуру Беларусі і Расіі.
3. Развіццё навукі.
4. Школьны тэатр.
5. Прыгонны тэатр (характарыстыка аднаго – па выбару студэнта).

Тэма 14. Культура Беларусі ў 20 – 30-ыя гг. XX ст.: літаратура, музыка, тэатр, адукацыя і навука, культура Заходняй Беларусі

1. Палітыка Савецкай дзяржавы ў галіне культуры.
2. Асаблівасці развіцця нацыянальнай культуры ў Заходняй Беларусі.
3. Літаратурныя аб’яднанні.
4. Творчасць Я. Купалы.
5. Творчасць Я. Коласа.
6. К. Чорны і яго творчасць.
7. Драматургія.
8. Стварэнне Саюза пісьменнікаў.
9. Сацыялістычны рэалізм.
10. Першы і Другі дзяржаўныя тэатры.
11. Першыя беларускія савецкія оперы.
12. Нараджэнне беларускага кіно.
13. Рэжысёр У. Галубок.
14. Творчасць беларускіх кампазітараў (характырастыка аднаго – па выбару студэнта).
15. Стварэнне новых музычных калектываў і ўстаноў.
16. Ліквідацыя непісьменнасці.
17. Навука ў БССР.
18. Выдатныя беларускія гісторыкі і іх навуковая спадчына (характырастыка аднаго – па выбару студэнта).

19. Прыродазнаўчыя і дакладныя навукі.
20. Краязнаўчая праца.

Тэма 16. Айчынная культура ў другой палове 50-х — першай палове 80-х гг. XX ст.: архітэктура і выяўленчае мастацтва

1. Пераход да індустрыяльных метадаў будаўніцтва.
2. Тыпавыя грамадскія і жылыя будынкі БССР.
3. Змены ў архітэктуры з 1970-х гг.
4. Жылы раён і мікрараён – галоўныя структурныя элементы буйнога горада БССР.
5. Будаўніцтва новых гарадоў у БССР.

## Самастойная кантралюемая работа студэнтаў

Тэма: Культура беларускіх зямель у IX — XIII стст.: літаратура (*абарона рэфератаў*)

1 Пісьменства.

2 Літаратура.

Тэма: Культура Беларусі ў XIV — першай палове XVII стст.: архітэктура і горадабудаўніцтва (*пісьмовая праверачная работа па ілюстрацыйных матэрыялах*)

1 Заходнееўрапейскія ўплывы.

2 Горадабудаўніцтва.

3 Ваеннае дойлідства.

4 Прыватнаўласніцкія замкі.

5 Архітэктурныя стылі.

Тэма: Айчынная культура ў другой палове XVII - XVIII стст.: літаратура, тэатр і музыка, адукацыя (*пісьмовая праверачная работа*)

1 Літаратура і грамадска-палітычная думка.

2 Навука.

3 Тэатр і музыка.

4 Адукацыя.

Тэма: Культура Беларусі ў 20 – 30-ыя гг. XX ст.: літаратура, музыка, тэатр, адукацыя і навука, культура Заходняй Беларусі (*абарона рэфератаў*)

1 Літаратура.

2 Тэатр, музыка, кіно.

3 Адукацыя і навука.

4 Культура Заходняй Беларусі.

Тэма: Айчынная культура ў другой палове 50-х — першай палове 80-х гг. XX ст.: архітэктура і выяўленчае мастацтва (*пісьмовая праверачная работа*)

1 Горадабудаўніцтва.

2 Архітэктура.

Тэма: Беларуская культура на сучасным этапе: тэатр, музыка, кінамастацтва (*творчая работа – падрыхтоўка прэзентацыі ў электронным выглядзе*)

1 Тэатральнае жыццё.

2 Музычнае жыццё.

# ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

### Тлумачальная запіска

Неабходнасць вывучэння курса «Гісторыя культуры Беларусі» абумоўлена павышэннем ролі сферы культуры ў сучасным свеце, значнасцю ведаў аб нацыянальных традыцыях для падрыхтоўкі высокакваліфікаванага спецыяліста ў галіне гісторыі, увядзеннем у школьную праграму прадмета "Сусветная і айчыйная культура".

Курс заклікаsuccessfully замацаваць у студэнтаў сістэматычныя веды ў галіне гісторыі айчыннай культуры як на ўзроўні фактаў, так і на ўзроўні іх тэарэтычнага і канцэптуальнага асэнсавання; сфарміраваць уяўленне аб месца і ролі культуры Беларусі ў гісторыі беларускага народа, у гісторыі еўрапейскай і сусветнай культуры; выхоўваць пачуццё патрыятызму і гонару за беларускі народ, яго дасягненні ў гістарычным мінулым і на сучасным этапе. Усё гэта з'яўляецца **мэтай** курса.

Да ліку **задач** належаць:

-азнаямленне студэнтаў з галоўнымі накірункамі вывучэннягісторыі айчыннай культуры ў беларускай і замежнай навуцы;

-вывучэнне найважнейшых з'яў, працэсаў, твораў, тэндэнцый і заканамернасцей яе развіцця;вызначэнне адметных рысаў культуры беларускага народа на розных этапах яго гістарычнага развіцця;

-разгляд гісторыі культуры Беларусі ў кантэксце гісторыі культуры славянскіх народаў, еўрапейскай і сусветнай культуры;

-паказ культур нацыянальных меншасцей, якія пражывалі і пражываюць на тэрыторыі Беларусі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

-асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі;

-культурна-гістарычную спадчыну беларускага грамадства;

-асноўныя этапы гісторыка-культурнай эвалюцыі беларускіх зямель;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**умець:**

-характарызаваць ролю і месца беларускіх зямель у сусветным культурным супольніцтве;

-растлумачыць уплывы розных цывілізацыйных фактараў на развіццё і станаўленне культуры Беларусі;

-ацэньваць асноўныя дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі ў кантэксце гістарычнага развіцця;

-аналізаваць культурна-гістарычныя з'явы ва ўмовах інтэграцыі і глабалізацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**валодаць:**

- асноўнымі паняццямі ў галіне розных відаў мастацтваў ва ўзаемасувязі з маральна-каштоўнасным і стылявым зместам культуры эпохі.

- ведамі аб асноўных тэндэнцыях развіцця сучаснай культуры ў свеце і ў Беларусі.

- навыкамі агульнакультурным, інтэлектуальнай падрыхтоўкі; сучаснымі, рознабаковымі ўяўленнямі аб развіцці культуры; асновамі камунікабельнасці і культурнай мабільнасці.

У працэсе сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі выпускнік установы вышэйшай адукацыі павінен развіць наступныя акадэмічныя кампетэнцыі (АК):

– АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

– АК-2. Валодаць метадамі навукова-педагагічнага даследавання.

У адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі выпускнік установы вышэйшай адукацыі пры падрыхтоўцы па адукацыйнай праграме першай ступені павінен набыць наступныя сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі (САК):

– САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

– САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

– СЛК-4. Валодаць навыкамі здароўязахавання.

У працэсе сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі выпускнік установы вышэйшай адукацыі павінен развіць наступныя прафесійныя кампетэнцыі спецыяліста:

– ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

Выкладанне дысцыпліны засноўваецца на ведах студэнтаў па курсам «Гісторыя Беларусі», «Гістарычнае краязнаўства Беларусі».

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на трэцім курсе ў першым семестры. Усяго на вывучэнне дысцыпліны “Гісторыя культуры Беларусі” адводзіцца ўсяго 80 гадзін, аўдыторных 50, з іх лекцыі – 30, семінары – 20. На самастойную работу адводзіцца 30 гадзін. На кіруемую самастойную работу адводзіцца 8 гадзін: 4 на лекцыі і 4 на семінарскія заняткі. Вывучэнне дысцыпліны заканчваецца прыняццем заліка (1 заліковая адзінка).

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел 1. Уводзіны

**Тэма 1.1. Уводзіны**

Гісторыя культуры Беларусі як навука і навучальная дысцыпліна. Айчынная культура — частка еўрапейскай і сусветнай культуры. Адметныя рысы гістарычнага развіцця культуры Беларусі, яе перыядызацыя. Крыніцы па гісторыі культуры Беларусь Іх публікацыі (навуковыя і вучэбныя). Асноўныя накірункі вывучэння гісторыі культуры Беларусі Сучасны стан навуковых даследаванняў. Значэнне вывучэння гісторыі беларускай культуры ў выхаванні выхаванні патрыёта і грамадзяніна, носьбіта нацыянальных культурных каштоўнасцей.

### Раздзел 2. Культура беларускіх зямель у эпоху першабытнага грамадства

**Тэма 2.1. Культура беларускіх зямель у эпоху першабытнага грамадства**

Матэрыяльная культура. Кераміка. Прылады працы. Рэчы хатняга ўжытку. Упрыгожанні. Светапогляд першабытнага чалавека.Дахрысціянскія вераванні. Пакланенне аб'ектам жывой і нежывой прыроды.Анімізм. Татэмізм. Фетышызм. Магія. Язычніцкі пантэон. Дэманалогія. Святы каляндарнага цыкла. Сямейныя святы і абрады авсета і выхавання.

### Раздзел 3. Культура беларускіх зямель у IX – XIII стст.

**Тэма 3.1. Культура беларускіх зямель у IX – XIII стст.: народная культура, архітэктура, мастацтва**

Умовы развіцця. Распаўсюджванне хрысціянства. Яго ўплыў на культуру і светаўспрыманне чалавека. Народная культура. Вусная народная творчасць. Паданні, прыказкі, прымаўкі. Абрадавыя песні, магічныя замовы, заклінанні, клятвы. Быліны. Скамарошаства як сінтэтычны від народнага мастацтва. Дваяверства. Хрысціянскія і паганскія элементы ў культуры. Святы, звычаі, абрады.

Горадабудаўніцтва . Ваеннае і грамадзянскае дойлідства. Планіроўка і забудова гарадоў. Гарадскія ўмацаванні. Замкі-данжоны. Камянецкая вежа. Культавая архітэктура. Полацкая і гродзенская школы дойлідства. Іх адметныя рысы. Сафійскі сабор у Полацку. Спаская царква. Храмы Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра. Дойлід Іаан. Гродзенскія цэрквы. Барысаглебская (Каложская) царква. Віцебская Дабравешчанская царква. Мураваныя храмы іншых гарадоў Беларусь Драўлянае дойлідства. Жывапіс. Мастацтва фрэскі. Манументальны роспіс Спаскай царквы. Візантыйска-кіеўскія ўплывы. Фрэскі полацкіх, віцебскага, навагрудскага, гродзенскага храмаў.

Іканапіс. Дэкаратыўна-прыкладное і ювелірнае мастацтва. Дробная пластыка.Упрыгожанні. Прадметы культу. Майстар-ювелір Лазар Богша. Крыж Ефрасінні Полацкай і яго мастацкія вартасці.

**Тэма 3.2. Культура беларускіх зямель у IX – XIII стст.: літаратура**

Помнікі эпіграфікі і пісьменства. Пячатка Ізяслава. Графіці. Барысавы камяні. Знаходкі берасцяных грамат. Бібліятэкі і скрыпторыі. Ефрасіння Полацкая. Тураўскае евангелле. Аршанскае евангелле. Літаратура. Перакладная літаратура. Кананічныя творы, патрыстыка, агіяграфія, пацерыкі і інш. Арыгінальная літаратура. Жыціі Ефрасінні Полацкай і Аўрамія Смаленскага. Аратарская проза. Асоба і творчасць Кірылы Тураўскага. Клімент Смаляціч. «Наказание» полацкага епіскапа Сімяона. Свецкая літаратура. «Слова пра паход Ігаравы» і беларускія землі. Праблема летапісання ў Полацку і Віцебску. Іпацьеўскі летапіс. «Летапісец Яропкіна».

**Раздзел 4. Культура Беларусі ў XIV – першай палове XVII стст.**

**Тэма 4.1. Культура Беларусі ў XIV – першай палове XVII стст.: архітэктура і горадабудаўніцтва**

Беларусь у Вялікім княстве Літоўскім. Этнічныя працэсы на беларускіх землях. Роля і месца культуры ў фарміраванні беларускай народнасці. Рэнесанс і яго ўплыў на айчынную культуру. Культура народных нізоў. Станаўленне самабытнага беларускага

фальклору. Сямейна-бытавыя святы. Цыклы абрадавай паэзіі. Казкі і іх тэматыка. Гістарычныя песні і паданні.

Архітэктура і горадабудаўніцтва. Новы этап развіцця беларускага горада. Заходнееўрапейскія ўплывы. Кампазіцыйны цэнтр горада. Замак і «места». Ваеннае дойлідства. Замкі-кастэлі. Ліда, Крэва, Меднікі. Замкі ў Віцебску, Гродне, Навагрудку. Прыватнаўласніцкія замкі. Замак у Міры – унікальны помнік айчыннага дойлідства. Нясвіж. Замкі ў Геранёнах, Ляхавічах. Фарміраванне палацава-замкавых комплексаў. Архітэктурныя стылі. Беларуская готыка. Рэнесанс. Храмы абарончага тыпу. Касцёлы ў Ішкалдзі, Камаях. Цэрквы-крэпасці ў Сынковічах, Мураванцы, Супраслі. Іх знешні дэкор і інтэр'ер. Пратэстанцкія зборы. Дом-крэпасць у Гайцюнішках. З'яўленне, станаўленне і адметныя рысы стылю барока. Ранняе барока. Я. М. Бернардоні. Касцёл езуітаў у Нясвіжы.

**Тэма 4.2. Культура Беларусі ў XIV – першай палове XVII стст.: мастацтва, літаратура, адукацыя**

Выяўленчае мастацтва. Манументальныя фрэскавыя роспісы. Візантыйска-рускія традыцыі. Рэалістычныя рысы. Люблін. «Еўхарыстыя», «Тайная вячэра», «Грамніцы». Сандамір, Кракаў. Візантыйска-сербскія ўплывы. Супрасль. Роспісы Куцеінскага Баогаяўленскага манастыра, магілёўскіх храмаў. Станаўленне беларускай школы іканапісу. «Маці Божая Адзігітрыя» са Слуцкага раёна, «Маці Божая Адзігітрыя Смаленская». Пётр Еўсяевіч з Галынца. «Нараджэнне Маці Божай» (1649). Зараджэнне свецкага партрэта. Парсуна. Сармацкі партрэт.

Гравюра. Т. Макоўскі. Скульптура і пластыка. Раманскі і гатычны стылі. «Распяцце». «Св. Гжэгаж». Рэнесанс і барока. Мемарыяльная пластыка. Надмагіллі з віленскай катэдры. Нясвіжскія надмагіллі Радзівілаў. Медальернае мастацтва. Майстар-разбяр Ананія.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Крыжы-энкалпіёны. Абразкі. Ювелірныя вырабы. Мастацкае шкло. Кавальскае майстэрства. Кафля. Рукапісная кніга. Кнігазборы. Кніга на пергаміне. Лаўрышаўскае евангелле. Абклад, мініяцюры. Уплыў гатычнага мастацтва. Мсціжскае і Полацкія евангеллі. Кніга на паперы. Жыровіцкае, Шарашоўскае евангеллі. Рэалістычныя рысы ў мастацкім афармленні.

Бібліятэкі Супрасльскага манастыра і Полацкага Сафійскага сабора. Прыватныя зборы. Кнігадрукаванне. Асоба і жыццёвы шлях Фрранцыска Скарыны. Пражскія і віленскія выданні. Гравюры выданняў Скарыны. Месца Францыска Скарыны ў гісторыі беларускай і еўрапейскай культуры. Пратэстанцкія кнігадрукары. Брэсцкая друкарня М. Радзівіла Чорнага. Сымон Будны. «Катэхізіс» і іншыя выданні. В. Цяпінскі. Прыватныя і брацкія друкарні.

Літаратура. Беларуска-літоўскае летапісанне. «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх». Беларуска-літоўскі звод 1446 г. «Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага». «Хроніка Быхаўца» - вяршыня беларуска-літоўскага летапісання. Змена жанраў і форм гістарычнай літаратуры. Баркулабаўскі летапіс. Дзённік Ф. Еўлашэўскага. Перакладная літаратура. Рыцарскі раман і воінская аповесць. «Троя». «Александрыя». «Аповесць пра Трышчана і Іжоту». Уздым арыгінальнай свецкай літаратуры ў канцы XVI – пачатку XVII ст. «Допісы» Ф. Кміты-Чарнабыльскага. Сатырычныя творы. «Прамова Мялешкі», «Ліст да Абуховіча». Паэзія. Зараджэннне паэзіі на старабеларускай мове. Францыск Скарына. «Епіграмы». А. Рымша. Л. Мамоніч. Паэт-патрыёт Я. К. Пашкевіч. Паэты-лацiністы. Мікола Гусоўскі. «Песня пра зубра». Ян Вісліцкі. «Пруская вайна». Перакладная і арыгінальная царкоўная літаратура. Агіяграфія. Апакрыфічныя творы. Гуманістычныя тэндэнцыі ў творчасці Грыгорыя Цамблака. Рэфармацыя і контррэфармацыя. Пратэстанцкія мысліцелі. С. Будны, В. Цяпінскі. Рэлігійная палеміка канца XVI – 1-й паловы XVII ст. Праваслаўныя публіцысты. М. Сматрыцкі. «Фрынас». Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі. Л. Карповіч. Каталіцкія і уніяцкія палемісты. П. Скарга і І. Пацей.

Тэатр і музыка. Традыцыі народнага мастацтва. Скамарохі, мядзведнікі. Узнікненне лялечнага тэатра «Батлейка». Тэатры пры брацкіх школах і езуіцкіх калегіумах. Асаблівасці іх рэпертуару. Музычныя інструменты. Калектывы выканаўцаў. Творы. «Полацкі сшытак».

Адукацыя. Сістэма адукацыі езуітаў. Калегіумы. Віленская акадэмія. Праваслаўныя брацкія школы. Базыльянскія навучальныя установы.

## Раздзел 5. Айчынная культура ў другой палове XVII – XVIII стст.

### Тэма 5.1. Айчынная культура ў другой палове XVII - XVIII стст.: архітэктура і мастацтва

Пагаршэнне ўмоў развіцця Беларусь Наступствы войн. Паланізацыя. Статус старабеларускай мовы. Народная культура. Вусная народная творчасць. Сацыяльныя матывы. Сатырычнасць. Гістарычны эпас. Казацкія песні. Народная культура – галоўны асяродак захавання беларускай нацыянальнай культуры. Горадабудаўніцтва і дойлідства. Росквіт архітэктуры барока. Сталае барока. Магілёўская школа дойлідства. Касцёл і кляштар бернардынак у Мінску. Позняе (віленскае) барока і яго адметнасць. Я. К. Глаўбіц, М. Д. Пёпельман, Дж. Сака. Полацкі Сафійскі сабор. Фарны касцёл у Гродне. Віцебская ратуша. Нясвіжскія помнікі. Ракако. Беразвецкі сабор. Пачатак распаўсюджвання класіцызму. Помнікі, пераходныя ад барока да класіцызму. Палацы ў Свяцку, Шчорсах, Ружанах. Змены ў планіроўцы гарадоў. А. Тызенгаўз. Прадмесце Гарадніца, Паставы. М. Агінскі. Слонім. Драўляная архітэктура. Ільінская царква ў Віцебску. Званіца ў Чэрску. Рысы народнага дойлідства.

Жывапіс і графіка. Узмацненне заходніх уплываў і рэалістычных тэндэнцый. Фрэскавы жывапіс. Роспісы праваслаўных і уніяцкіх цэркваў у Магілёве, Мсціславе, Віцебску. Фрэскі касцёлаў св. Станіслава ў Магілёве, Божага Цела ў Нясвіжы. Уздым беларускай школы іканапісу. Абразы «Маці Божая Адзігітрыя Баркулабаўская», «Сашэсце ў пекла», «Грамніцы». Магілёўскі майстар А. Пігарэвіч. К. Д. Гескі. «Тайная вячэра». Свецкі партрэт. Яго разнавіднасці: парадны, рыцарскі, пахавальны. Уплывы класіцызму. Кніжная гравюра. Аляксандр і Лявонцій Тарасевічы. Магілёўская гравёрная школа. Максім і Васіль Вашчанкі. Фёдар Ангілейка. Герш Ляйбовіч. «Выявы княжацкай Радзівілаўскай сям'і».

Скульптура і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Разьба па дрэве. Майстар Пётр з Нягневічаў. Іканастасы, царскія брамы, алтары. Іканастас Мікалаеўскай царквы ў Магілёве. Інтэр'еры касцёлаў у Пінску, Гродне, Слоніме. Мастацкае шкло. Вырабы Налібоцкай і Урэцкай мануфактур. Слуцкія паясы. Дзейнасць беларускіх майстроў у Маскве. Перасяленне беларускіх рамеснікаў у Расію. Беларуская разьба. Арцель Кліма Міхайлава. Іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве. Палац у Каломенскім. Творы беларускіх майстроў у Аружэйнай, Залатой, Сярэбранай палатах Крамля. Цаніннае майстэрства. Арцель Ігната Максімава.

### Тэма 5.2. Айчынная культура ў другой палове XVII - XVIII стст.: літаратура, тэатр і музыка, адукацыя

Літаратура. Паэзія Сімяона Полацкага. «Псалтырь рифмотворная», «Вертоград многоцветный», «Рифмологион». Барочныя рысы. Уклад Сімяона Полацкага ў культуру Беларусі і Расіі. Ян (Андрэй) Белабоцкі. Філасофска-тэалагічныя роздумы. Заняпад старабеларускай літаратуры. Працяг гумарыстычнай традыцыі. «Прамовы русіна». К. Марашэўскі. «Камедыя». М. Цяцерскі. Інтэрмедыі. «Селянін у касцёле», «Чорт Асмалейка» і інш. Грамадска-палітычная думка. Погляды на ўладу і грамадства С. Полацкага. І. Капіевіч. Г. Каніскі і абарона праваслаўя ў Рэчы Паспалітай. Перамога контррэфармацыі. К. Лышчынскі. Трактат «Аб неіснаванні Бога».

Распаўсюджанне ідэй Асветніцтва. Навука. М. Пачобут-Адляніцкі. Філасофія. К. Нарбут.

Тэатр і музыка. Школьны тэатр. Пастаноўкі на рэлігійную і гістарычную тэматыку. Батлейка. «Цар Максімільян». Народныя сцэнкі. Прыгонны тэатр. Нясвіжскі і слуцкі тэатры Радзівілаў. Тэатры ў Гродне, Слоніме, Шклове. Харавыя шматгалосыя спевы. Канты. Псалмы. Украінскі музычны дзеяч М. Далецкі. Беларускія музыкі Мезенец і Е. Славінецкі.

Адукацыя. Адукацыя ў брацкіх школах. Полацкая і магілёўская брацкія школы. Склад выкладчыкаў і вучняў. Аслабленне пазіцый брацтваў. Заняпад брацкіх школ. Пашырэнне сеткі езуіцкіх калегіумаў. Піярскія школы. С. Канарскі. Утварэнне Эдукацыйнай камісіі. План і вынікі яе дзейнасці.

## Раздзел 6. Культура Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст.

### Тэма 6.1. Культура Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст.: архітэктура, мастацтва

Уваходжанне Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Палітыка царызму ў дачыненні да беларускіх зямель. Змены ў культуры як фактар і паказчык фарміравання нацыі.

Архітэктура. Панаванне класіцызму. Новыя планы гарадоў. Палацава-паркавыя комплексы. Дзейнасць Румянцавых. Гомель. Палацы Агінскіх у Залессі, Тызенгаўза ў Паставах. Сядзібны дом у Відзах-Лаўчынскіх. Уплывы рамантызму. Пейзажныя і пейзажна-рамантычныя паркі. Мураванае культавае дойлідства. Магілёўскі Іосіфаўскі і гомельскі Петрапаўлаўскі саборы. Касцёл Св. Тэрэзы ў Шчучыне. Адміністрацыйна-грамадскія будынкі. Палацы губернатараў. Губернскія праўленні. Грамадзянская архітэктура. Будынак Дваранскага сходу ў Слуцку. Аб'екты гандлёва-гаспадарчага прызначэння. Карпусы навучальных устаноў. Ваеннае будаўніцтва. Абарончыя збудаванні ў Барысаве. Бабруйская і Брэсцкая крэпасці. Драўлянае дойлідства. Палеская школа.

Выяўленчае мастацтва. Жывапіс. Перавага свецкіх твораў. Найбуйнейшыя мастацкія школы. Факультэт жывапісу, скульптуры і графікі Віленскага універсітэта. Імператарская Акадэмія мастацтваў у Санкт-Пецярбургу. Накірункі. Класіцызм. Акадэмізм. Рамантызм. Роля Полацкай езуіцкай акадэміі. Жанры. Партрэтны, бытавы, гістарычны, пейзажны. І. Хруцкі. Нацюрморты, партрэты. Графіка. Літаграфіі і малюнкі К. Бахматовіча. А. Бартэльс. Сатыра, карыкатуры. М. Кулеша. «Царква Барыса і Глеба на Каложы ў Гродне». Скульптура. Барэльефы і медальёны. Манументальна-дэкаратыўная скульптура. Унутраны і знешні дэкор палацаў і сядзіб. Культавыя будынкі.

### Тэма 6.2. Культура Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст.: літаратура, музычна-тэатральнае мастацтва, асвета і адукацыя

Літаратура. Зараджэнне новай беларускай літаратуры. Ян Чачот. А. Рыпінскі. У. Сыракомля. А. Міцкевіч і беларуская літаратура. Ян Баршчэўскі. «Шляхціц Завальня». Паэт-самародак П. Багрым. Ананімныя паэмы «Энеіда навыварат» і

«Тарас на Парнасе». Праблема іх аўтарства. Творы В. Дуніна-Марцінкевіча. Іх месца і роля ў станаўленні новай беларускай літаратуры.

Музычнае і тэатральнае мастацтва. Народная музыка і народны тэатр. Творчасць М. К. Агінскага. Выцясненне польскага прафесійнага тэатра рускім. Мінскі тэатр. Дзейнасць В. Драздоўскага. Трупа В. Дуніна- Марцінкевіча, рэпертуар і акцёры. С. Манюшка. «Сялянка» і пачатак беларускай оперы.

Адукацыя і асвета. Вышэйшая адукацыя. Полацкая езуіцкая акадэмія. Віленскі універсітэт. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Сярэднія і пачатковыя навучальныя ўстановы. Рэформа сістэмы асветы напачатку XIX ст. Віленская вучэбная акруга. А. Чартарыйскі. Узмацненне паланізацыі навучальных устаноў. Змены ў палітыцы царызму пасля паўстання 1830 — 1831 гг. Скасаванне Віленскага універсітэта. Спробы русіфікацыі сістэмы асветы. Навука. Віленскі універсітэт — буйны навуковы цэнтр Беларусі і Літвы. Прыродазнаўчая плынь. А. і Я. Снядэцкія, Г. Баянус. Гуманітарныя навукі. І. Анацэвіч, М. Баброўскі, І. Даніловіч, І. Лялевель. Гомельскі гурток. І. Грыгаровіч. «Беларускі архіў старажытных грамат». Пачатак этнаграфічнага вывучэння Беларусі. З. Даленга-Хадакоўскі. Даследаванне Беларусі расійскімі вучонымі. Экспедыцыі акадэмікаў І. Ляпёхіна і В. Севергіна. Навуковая дзейнасць выхадцаў з Беларусі па-за яе межамі. І. Дамейка.

## Раздзел 7. Развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.

### Тэма 7.1. Развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.: архітэктура, выяўленчае мастацтва

Горадабудаўніцтва і архітэктура. Рост гарадоў і новыя рысы ў іх планіроўцы. Прывілеяваны цэнтр і рабочыя ўскраіны. Архітэктурная эклектыка. «Гістарычныя» стылі: рэтраспектыўна-гатычны, рэтраспектыўна-рускі, неарускі, неараманскі, неаготыка, неарэнесанс, неабарока, неакласіцызм і інш. Сядзібныя будынкі. Адыход ад гістарызма. Стыль мадэрн. Новыя формы, прыёмы, дэкор, матэрыялы. Даходныя дамы, банкаўскія будынкі. Сядзібны дом у Галавічполлі. Драўлянае дойлідства.

Выяўленчае мастацтва. Этапы. Віленская рысавальная школа. Гістарычная тэматыка. К. Альхімовіч. Бытавы жанр. І. Трутнеў. Н. Сіліваловіч. «Пастух са Свянцяншчыны». Мазаікі Ісакіеўскага сабора ў Санкт-Пецярбургу. Пейзажы А. Гараўскага. «Вечар у Мінскай губерні». Партрэт. Б. Русецкі. А. Ромер. «Партрэт паўстанца 1863 г.» Графіка. Архітэктурныя пейзажы Н. Орды. Змены ў тэматыцы і жанрах у канцы XIX ст. Панаванне пейзажу. Уплывы новых накірункаў заходнееўрапейскага мастацтва. Ф. Рушчыц. «Зямля», «Ля касцёла», «Пустка (Восеньскі вецер)». Сацыяльная праблематыка. Г. Вейсенгоф. В. Бялыніцкі-Біруля. Праца расійскіх мастакоў на Беларусь І. Рэпін. «Беларус». І. Шышкін. Бытавы і партрэтны жанры. Віцебская мастацкая школа. Ю. Пэн. Карыкатуры К. Кастравіцкага. Скульптура. Я. Драздовіч, К. Кастравіцкі.

**Тэма 7.2. Развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.: літаратура, музыка і тэатр, навука і адукацыя**

Літаратура. Агітацыйныя творы. «Гутарка старога дзеда», «Гутарка двух суседаў». Публіцыстыка К. Каліноўскага. Творчасць А. Абуховіча і Ф. Тапчэўскага. Літаратурная і грамадская дзейнасць Ф. Багушэвіча. Паэзія. «Дудка беларуская», «Смык беларускі». Проза і публіцыстыка. Я. Лучына. «Вязанка». А. Гурыновіч. Тэматыка сацыяльнага вызвалення. Ліберальная і кансерватыўная плыні. А. Ельскі. А. Пшчолка. «Нашаніўскі» перыяд. Газета «Наша ніва» — галоўны асяродак беларускага руху. Супрацоўнікі і аўтары. Роля «Нашай нівы» ў станаўленні новай беларускай літаратуры і дітаратурнай мовы. Беларускія выдавецкія суполкі ў Вільні і Санкт-Пецярбургу. Б. Эпімах-Шыпіла. В. Іваноўскі. І. і А. Луцкевічы.

Тэатральнае і музычнае мастацтва. Станаўленне прафесійнага тэатра. Гастролі рускіх, украінскіх і польскіх тэатраў на Беларусь Таварыства аматараў мастацтваў у Мінску. Мінскі гарадскі тэатр. Аматарскія калектывы. Беларускі нацыянальны тэатр. «Беларускія вечарынкі». І. Буйніцкі. «Першая беларуская трупа». Рэпертуар. Гастролі. «Беларускі музычна-драматычны гурток» у Вільні. Народный тэатральныя прадстаўленні. «Першае таварыства беларускай драмы і камедыі» ў Мінску. Музыка. М. Ельскі і Н. Орда. Народная песня. Апрацоўкі У. Тэраўскага, Л. Рагоўскага, А. Грыневіча. Хор У. Тэраўскага. І. Шадурскі. Беларуская музычная камедыя «Тарас на Парнасе». Гастролі расійскіх кампазітараў і выканаўцаў на Беларусь.

Адукацыя. Палітыка царызму ў галіне адукацыі пасля паўстання 1863 г. Скасаванне Горы-Горыцкага земляробчага інстытута і іншых навучальных устаноў. Асаблівасці правядзення школьнай рэформы на Беларусь Пачатковая школа. Праблемы развіцця. Царкоўна-прыходскія школы. Народныя вучылішчы. Гарадскія вучылішчы. Іх колькасныя суадносіны. Узровень пісьменнасці насельніцтва Беларусі. Прафесійная адукацыя. Настаўніцкія семінарыі і інстытуты. Духоўныя семінарыі. Сярэдняя школа. Класічныя і рэальныя гімназіі (вучылішчы). Рост колькасці навучальных устаноў напачатку XX ст.

Праблема вышэйшай школы на Беларусь. Навука. Гуманітарныя дысцыпліны. Ідэйныя плыні. «Заходнерусізм». К. Гаворскі, М. Каяловіч. Пачатак нацыянальнай гістарыяграфіі. Працы М. Доўнар-Запольскага. В. Ластоўскі. «Кароткая гісторыя Беларусі». Вучоныя-этнографы. А. Кіркор, П. Шэйн, Е. Раманаў. Мовазнаўства. «Словарь белорусского наречия» І. Насовіча. Я. Карскі. «Беларусы» — фундаментальная праца па беларусазнаўстве. Навуковыя таварыствы. Прыродазнаўчыя і сельскагаспадарчая навукі. Беняконская сельскагаспадарчая і Мінская балотная станцыі. Медыцына. Таварыства мінскіх урачоў. Дзейнасць В. Наркевіча-Ёдкі. Навуковыя даследаванні беларусаў па-за межамі радзімы. І. Чэрскі.

**Раздзел 8. Культура Беларусі ў 20 – 30-ыя гг. XX ст.**

**Тэма 8.1. Культура Беларусі ў 20 – 30-ыя гг. XX ст.: архітэктура і выяўленчае мастацтва**

Умовы развіцця. Палітыка Савецкай дзяржавы ў галіне культуры. Рэпрэсіі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі Асаблівасці развіцця нацыянальнай культуры ў Заходняй Беларусі. Горадабудаўніцтва і архітэктура. Індустрыяльнае будаўніцтва. Прамысловая архітэктура. Аднаўленне жыллёвага будаўніцтва. Рабочыя пасёлкі. Грамадскія будынкі. Павільённая сістэма. Універсітэцкі гарадок БДУ. Уплывы канструктывізму. Г. Гольц, М. Паруснікаў. Будынак Дзяржбанка ў Мінску. Э. Лосер. Кінатэатр «Чырвоная зорка» ў Магілёве. Белдзяржпраект. Распрацоўка генеральных планаў гарадоў. Г. Лаўроў. Галоўны корпус бібліятэкі імя У. Леніна. Неакласіцызм. Праекты І. Лангбарда. А. Воінаў, У. Вараксін. Будынак ЦК КПБ.

Выяўленчае мастацтва. Агітацыйнае мастацтва. М. Шагал. Экспрэсіянізм. К. Малевіч, Л. Лісіцкі, В. Ермалаева. Супрэматызм. Віцебск — буйны цэнтр мастацкага жыцця. Віцебскі мастацка-практычны інстытут. Жывапіс. Тэматычная карціна. Пейзажы. В. Бялыніцкі-Біруля. Фальклорная і гістарычная тэматыка. Індустрыяльная праблематыка. Партрэтны жанр. І. Ахрэмчык. В. Волкаў. Ю. Пэн. Новыя рысы творчасці. Графіка. М. Дабужынскі, С. Юдовін. Скульптура. Звужэнне тэматыкі. Жывапіс. Рэвалюцыйная праблематыка. Партрэтны жанр. М. Тарасікаў. Партрэт акадэміка М. Нікольскага. Манументальны жывапіс. Роспісы Дома ўрада БССР. Скульптура. А. Бембель. Гарэльефы. Г. Манізер. Помнік У. Леніну. Партрэтныя працы А. Бразера і З. Азгура.

**Тэма 8.2. Культура Беларусі ў 20 – 30-ыя гг. ХХ ст.: літаратура, музыка, тэатр, адукацыя і навука, культура Заходняй Беларусі**

Літаратура. Літаратурныя аб'яднанні. «Маладняк». «Узвышша». «Полымя». БелАПП. Склад сяброў. Ідэйная накіраванасць. Паэзія. Я. Купала. Я. Колас. «Новая зямля», «Сымон-музыка». Вершы і паэмы У. Дубоўкі. А. Дудар. «Пасеклі край наш папалам». Першыя рэпрэсіі. Станаўленне прозы. Аўтары. Формы. Праблематыка. Я. Колас. Пачатак трылогіі «На ростанях». К. Чорны. Апавяданні. «Маладнякоўская аповесць». Сатыра. А. Мрый. «Запіскі Самсона Самасуя». Драматургія. Я. Купала. «Тутэйшыя». Перабудова літаратурна-мастацкіх арганізацый. Стварэнне Саюза пісьменнікаў (1934). Сацыялістычны рэалізм. Я. Купала. «Над ракою Арэсай». Новае жыццё і новы чалавек у празаічных творах. Аповесці і апавяданні Я. Коласа, М. Лынькова, П. Галавача, С. Баранавых. К. Чорны. «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне».

Драматургія. К. Крапіва. «Хто смяецца апошнім». Э. Самуйлёнак. Тэатр, музыка і кінамастацтва. Першы і Другі Беларускія дзяржаўныя тэатры. Рэпертуар. Пастаноўка «Тутэйшых». Беларускі Дзяржаўны вандроўны тэатр Ул. Галубка. Першыя беларускія савецкія оперы. М. Чуркін, М. Аладаў. Нараджэнне беларускага кіно. Кінастудыя «Савецкая Беларусь» у Ленінградзе. Кінахроніка. Ю. Тарыч. «Лясная быль» (1926). Рэарганізацыя тэатральнага жыцця. Трэці Беларускі дзяржаўны тэатр. Рэжысёр У. Галубок. Акцёры Г. Глебаў, І. Ждановіч.

Кампазітары. Оперы Я. Цікоцкага, А. Багатырова, А. Туранкова. Стварэнне новых музычных калектываў і устаноў. Белдзяржфілармонія. Тэатр оперы і балета. Беларуская кансерваторыя. Кінарэжысёры.

Адукацыя і навука. Ліквідацыя непісьменнасці. Школы, лікпункты. Уніфікацыя пачатковай і сярэдняй школы.Увядзенне ўсеагульнага абавязковага навучання (1926). Сярэдняя спецыяльная адукацыя. Вышэйшыя навучальныя установы. Стварэнне Белдзяржуніверсітэта. Праблемы і вынікі станаўлення новай сістэмы адукацыі. Навука. Навукова-тэрміналагічная камісія. Інстытут беларускай культуры. Беларуская Акадэмія навук. Галоўныя накірункі развіцця навукі. Гісторыя. У. Ігнатоўскі, М. Доўнар-Запольскі. Археаграфічная праца. Літаратуразнаўства. І. Замоцін, М. Гарэцкі, М. Піятуховіч. Фальклярыстыка. А. Сержпутоўскі. Мастацтвазнаўства. М. Шчакаціхін. «Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва». Прыродазнаўчыя і дакладныя навукі. Краязнаўчая праца.

Культура Заходняй Беларусі. Беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі. Палітыка Польскай дзяржавы ў дачыненні да беларусаў. Адукацыя, прапаганда нацыянальных ідэй і вывучэннне культурнай спадчыны беларускага народа. Рух за беларускую школу. Таварыства беларускай школы. Беларускія гімназіі і школы. Грамадская і навуковая дзейнасць Б. Тарашкевіча. М. Гарэцкі. «Гісторыя беларускае літаратуры». І. І А. Луцкевічы. Заснаванне і дзейнасць беларускага музея ў Вільні. Далучэнне да СССР і БССР. Змены ў культурным жыцці. Р. Шырма. Беларускі ансамбль песні і танца. Літаратурны працэс. Ідэйныя плыні. Жанры і формы. Публіцыстыка мяжы 1910—1920-х гг. А. Луцкевіч, А. Смоліч, У. Самойла, А. Цвікевіч. І. Абдзіраловіч. «Адвечным шляхам». Рамантычны накірунак. У. Жылка, Л. Родзевіч. Рэлігійны рамантызм К. Сваяка. Лірыка Н. Арсенневай. Зборнік «Пад сінім небам». Драматургія. П'есы Ф. Аляхновіча. Проза. Х. Ільяшэвіч. Рэвалюцыйны накірунак. П. Пестрак, В. Таўлай. Пачатак літаратурнай дзейнасці М. Танка. «На этапах». Выяўленчае мастацтва. Асоба і дзейнасць Я. Драздовіча. Студыя-майстэрня пры Віленскай беларускай гімназіі. Жывапіс. Гістарычная тэматыка. Сімвалічна-алегарычныя працы. Фантастычна-касмічныя цыклы. Графіка. Скульптура. П. Сергіевіч. «Беларусы», «Шляхам жыцця». М. Сеўрук. «Жніво».

## Раздзел 9. Культура Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе

### Тэма 9.1. Культура Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе

Наступствы вайны. Палітычны рэжым. Ваенная тэматыка ў літаратуры і мастацтве.

Архітэктура і выяўленчае мастацтва. Аднаўленне гарадоў і вёсак. Новыя генеральныя планы гарадоў. Генеральны план забудовы г. Мінска (1946). Пераход да радыяльна-кальцавой планіровачнай сістэмы. Прамысловае будаўніцтва. Белпрампраект. Архітэктура. Уплывы класіцызму і эклектыкі.

Жывапіс. Ваенная тэматыка. А. Шыбнёў, Я. Зайцаў. Адлюстраванне культу асобы І. Сталіна ў працах мастакоў. Скульптура. З. Азгур. Партрэты. Манумент Перамогі ў Мінску.

Літаратура. Тэорыя бесканфліктнасці. Новае пакаленне творцаў. І. Шамякін. Раманы. Вясковая тэматыка. Я. Брыль. «У Забалоцці днее». Першыя спробы крытыкі. «На Быстранцы». Рэвалюцыйная тэматыка. М. Лынькоў, П. Пестрак. Я. Колас. Завяршэнне трылогіі «На ростанях». Паэзія. Грамадзянскі пафас.

Публіцыстычнасць. А. Куляшоў, П. Панчанка. Драматургія. Тэма вайны. А. Маўзон. К. Губарэвіч. Камедыйны жанр. К. Крапіва. А. Макаёнак. «Выбачайце, калі ласка!»

Тэатр і музыка. Барацьба з касмапалітызмам. Тэатральны рэпертуар. Спектаклі. «Пяюць жаваранкі». Пастаноўкі Рускага драматычнага тэатра. Акцёры. Музыка. Дз. Лукас. Опера «Кастусь Каліноўскі». Р. Пукст. «Машэка». М. Аладаў, П. Падкавыраў, У. Алоўнікаў. Стварэнне Дзяржаўнага народнага хора БССР. Дзейнасць Г. Цітовіча.

Адукацыя і навука. Аднаўленнне дзейнасці навучальных навуковых устаноў. Школьная рэформа. Сямігадовыя і сярэднія школы. Скарачэнне колькасці беларускамоўных школ. Праблемы вышэйшай школы. Адкрыццё новых інстытутаў. Беларускі тэатральны інстытут, Мінскі дзяржаўны інстытут замежных моў, Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту ў Гомелі і інш. Новыя накірункі развіцця айчыннай навукі. Беларуская школа генетыкі. Прэзідэнт АН БССР А. Жэбрак.

## Раздзел 10. Айчынная культура ў другой палове 50-х – першай палове 80-х гг. ХХ ст.

### Тэма 10.1. Айчынная культура ў другой палове 50-х – першай палове 80-х гг. ХХ ст.: архітэктура і выяўленчае мастацтва

Развянчанне культу асобы І. Сталіна. «Адліга». Лібералізацыя грамадскага і культурнага жыцця. «Шасцідзесятнікі». Узмацненне кантролю над сферай культуры з сярэдзіны 60-х гг. Русіфікацыя. Горадабудаўніцтва і архітэктура. Пераход да індустрыяльных метадаў будаўніцтва. Уплыў на архітэктурнае аблічча населеных пунктаў. Тыпавыя жылыя і грамадскія будынкі. Змены ў архітэктуры з 70-х гг. Жылы раён і мікраараён – галоўныя структурныя элементы буйнога горада. Будаўніцтва новых гарадоў. Салігорск, Наваполацк, Жодзіна і інш.

Выяўленчае мастацтва. Асноўныя праблемы і накірункі развіцця. Вялікая Айчынная вайна ў творчасці М. Савіцкага. Цыкл «Лічбы на сэрцы». Л. Шчамялёў. Ваенная і сучасная тэматыка. Тэма радзімы. М. Данцыг. «Мой Мінск». У. Стальмашонак. Партрэты Р. Шырмы і Я. Коласа. Пстарычнае мінулае. А. Марачкін. Манументальны жывапіс. І. Кішчанка. Мазаікі. Графіка. В. Шаранговіч, У. Басалыга. Скульптура. А. Анікейчык, Л. Гумілеўскі, А. Бембель. Мемарыяльныя комплексы «Хатынь», «Брэсцкая крэпасць-герой».

### Тэма 10.2. Айчынная культура ў другой палове 50-х – першай палове 80-х гг. ХХ ст.: літаратура, музыка, тэатр і кіно

Літаратура. Вяртанне рэпрэсіраваных літаратараў. У. Дубоўка, Я. Пушча, А. Звонак, Я. Скрыган. С. Грахоўскі. «Дзень нараджэння». Проза. Ваенная тэматыка. Асоба В. Быкава. Аповесці «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Сотнікаў» і інш. Росквіт беларускага рамана ў 60-я гг. Эпічная трылогія І. Мележа «Людзі на балоце». Гісторыя ў рамантычным бачанні У. Караткевіча. І. Шамякін. Жыццё беларускага горада. Паэзія. Старэйшае пакаленне. М. Танк, П. Панчанка, П.

Броўка, А. Куляшоў. Грамадзянская пазіцыя. Барацьба за мір. Новае пакаленне. А. Вярцінскі, Н. Гілевіч, Р. Барадулін. «Жаночая паэзія».

Драматургія. Класічныя творы А. Макаёнка. «Лявоніха на арбіце», «Трыбунал», «Таблетку пад язык». М. Матукоўскі, А. Дзялендзік. Раннія п'есы А. Дударава.

Тэатр, музыка і кіно. Новыя тэатры. Рэжысёры. Пастаноўкі. Акцёры. С. Станюта, Г. Гарбук, 3. Канапелька. Музыка. Опера і аперэта. Балетнае мастацтва. Я. Глебаў, Г. Вагнер, А. Мдзівані. Песенны жанр. І. Лучанок, Э. Ханок, Л. Захлеўны. Эстрадная музыка. ВІА «Песняры», «Сябры». Кіно. Студыя «Беларусьфільм». В. Корш-Саблін. «Масква — Генуя». Дакументальнае кіно.

**Тэма 10.3. Айчынная культура ў другой палове 50-х – першай палове 80-х гг. XX ст.: адукацыя і навука**

Адукацыя і навука. Школьныя рэформы. Дасягненні. Супярэчнасці. Пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі. Новыя ВНУ. Адкрыццё Гомельскага і Гродзенскага дзяржаўных універсітэтаў. Паскоранае развіццё фундаментальнай навукі. Фізіка і матэматыка. Б. Сцяпанаў, М. Ельяшэвіч, М. Барысевіч. Біёлаг В. Купрэвіч.

Культура беларускай дыяспары. Беларуская бібліятэка і музей у Лондане. Перыядычны друк. Паэзія Л. Геніюш, Н. Арсенневай. Спявак М. Забэйда-Суміцкі. Навуковыя даследаванні. Ян Станкевіч.

**Раздзел 11. Беларуская культура на сучасным этапе**

**Тэма 11.1. Беларуская культура на сучасным этапе: нацыянальна-культурнае адраджэнне і архітэктура**

Нацыянальна-культурнае адраджэнне. Значэнне беларускай культуры і мовы. Духоўныя арыенціры. Дзяржаўная палітыка ў галіне культуры.

Новыя рысы ў горадабудаўніцтве, архітэктуры і выяўленчым мастацтве. Аднаўленне храмавага дойлідства. Творчасць мастакоў А.Марачкіна, М. Селешчука, М. Купавы, У. Савіча.

**Тэма 11.2. Беларуская культура на сучасным этапе: літаратура**

Абнаўленне літаратуры. Грамадскае гучанне. Публіцыстыка А. Адамовіча. С. Алексіевіч. «Цынкавыя хлопчыкі». Гістарычная тэматыка. У.Арлоў, Л. Дайнека, К. Тарасаў і інш. Творчасць А. Глобуса. Паэзія. А. Разанаў, Л. Дранько-Майсюк, У. Някляеў, Г. Булыка.

Драматычныя творы А.Дударава.

**Тэма 11.3. Беларуская культура на сучасным этапе: тэатр, музыка, кінамастацтва**

Тэатральнае жыццё. Новыя формы і змест. Тэатр-лабараторыя беларускай драматургіі «Вольная сцэна». В. Мазынскі. Альтэрнатыўны тэатр. Новыя тэатральныя пастаноўкі. М. Пінігін. «Тутэйшыя».

Музыка. У. Солтан. Оперы. Сімфоніі Дз. Смольскага, В. Войціка. Песенны жанр. Рок-музыка. Гурты «Новае неба», «Мроя», «Крама» і інш. Беларускі балет. Пастаноўкі В. Елізар'ева.

Кінарэжысёры М. Пташук, В. Дашук. Тэатральныя, музычныя і кінафестывалі. «Славянскі базар» у Віцебску. Гастролі беларускіх мастацкіх калектываў за мяжой.

Навука. Праблемы. Дасягненні. Перспектывы развіцця.

Культурнае і навуковае жыццё беларусаў замежжа. Літаратура і мастацтва.

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ”

Мэтай метадычных рэкамендацый з’яўляецца павышэнне эфектыўнасці вучэбнага працэсу, у тым ліку дзякуючы самастойнай рабоце, у якой студэнт становіцца актыўным суб’ектам навучання, што азначае:

- здольнасць займаць у навучанні актыўную пазіцыю;
- магчымасць мабілізаваць інтэлектуальныя і валявыя намаганні для дасягнення вучэбных мэтаў;
- уменне праектаваць, планаваць і прагназаваць вучэбную дзейнасць;
- звычку ініцыяваць сваю пазнавальную дзейнасць на аснове ўнутранай станоўчай матывацыі;
- усведамленне сваіх патэнцыяльных вучэбных магчымасцяей і псіхалагічную падрыхтаванасць скласці праграму дзейнасці па самаразвіццю.

### Віды самастойнай работы студэнтаў

| | |
|---|---|
| Рэпрадуктыўная самастойная работа | Самастойнае азнаямленне, прагляд, канспектаванне вучэбнай літаратуры, праслухоўванне лекцый, завучванне, пераказ, запамінанне, інтэрнэт-рэсурсы, паўтарэнне вучэбнага матэрыялу |
| Пазнавальна-пошуквая самастойная работа | Падрыхтоўка паведамленняў, дакладаў, выступленняў на семінарскіх і практычных занятках, падбор літаратуры па праблемах дысцыпліны, напісанне рэфератаў, кантрольных, курсавых работ і інш. |
| Творчая самастойная работа | Падрыхтоўка тэзісаў і навуковых артыкулаў, удзел у навукова-даследчай рабоце, падрыхтоўка дыпломнай работы (праекта), удзел у студэнцкай навуковай канферэнцыі, студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі |

### Арганізацыя кантролю самастойнай работы

Для паспяховага выканання самастойнай работы студэнтаў неабходна планаванне і кантроль з боку выкладчыкаў. Аўдыторная самастойная работа выконваецца студэнтамі на лекцыях, семінарскіх занятках, таму выкладчык павінен загадзя пабудаваць сістэму самастойнай работы з улікам яе форм, мэты, адбіраючы вучэбную і навуковую інфармацыю і сродкі камунікацый, прадумваючы ролю студэнта ў гэтым працэсе і свой удзел у ім.

Пытанні для самастойнай працы студэнтаў, названыя ў рабочай праграме дысцыпліны, прапануюцца выкладчыкамі ў пачатку вывучэння дысцыпліны.

**Змест дзейнасці выкладчыка і студэнта пры выкананні самастойнай работы**

| Асноўныя характарыстыкі | Дзейнасць выкладчыка | Дзейнасць студэнтаў |
|---|---|---|
| Мэта выканання СР | -тлумачыць мэту і сэнс выканання СР;<br>-дае разгорнуты інструктаж аб патрабаваннях, прад'яўляемых да СР і спосабах яе выканання;<br>-дэманструе ўзор СР | -разумее і прымае мэту СР як асобасна значную;<br>-знаёміцца з патрабаваннямі да СР |
| Матывацыя | -раскрывае тэарэтычную і практычную значнасць выканання СР, тым самым фарміруе ў студэнта пазнавальную патрэбу і гатоўнасць да выканання СР;<br>матывуе студэнта на дасягненне поспеху | -фарміруе ўласную пазнавальную патрэбу ў выкананні СР;<br>-фарміруе ўстаноўку і прымае рашэнне аб выкананні СР |
| Кіраванне | -ажыццяўляе кіраванне шляхам мэтанакіраванага ўздзеяння на працэс выканання СР;<br>-дае агульныя арыенціры выканання СР | -на аснове валодання абагульненым прыёмам сам ажыццяўляе кіраванне СР (праектуе, плануе, рацыянальна размяркоўвае час і г.д.) |
| Кантроль і карэкцыя выканання | -ажыццяўляе папярэдні кантроль, які прадугледжвае выяўленне зыходнага ўзроўню гатоўнасці студэнта да выканання СР;<br>-ажыццяўляе выніковы кантроль канчатковага выніку выканання СР | -ажыццяўляе бягучы аперацыйны самакантроль за ходам выканання СР;<br>-выяўляе, аналізуе і выпраўляе дапушчаныя памылкі, уносіць карэктывы ў работу, адсочвае ход выканання СР;<br>-вядзе пошук аптымальных спосабаў выканання СР;<br>-ажыццяўляе рэфлексіўнае стаўленне да ўласнай дзейнасці;<br>-ажыццяўляе выніковы самакантроль |

| | | |
|---|---|---|
| | | выніку СР |
| Ацэнка | -на аснове параўнання выніку з узорам, загадзя зададзенымі крытэрамі дае ацэнку СР;<br>-выяўляе тыповыя памылкі, падкрэслівае станоўчыя і адмоўныя бакі, дае метадычныя парады па выкананні СР, намячае далейшыя шляхі выканання СР;<br>-устанаўлівае ўзровень і вызначае прагрэс студэнта, фарміруе ў яго матывацыю дасягнення поспеху ў вучэбнай дзейнасці | -на аснове суаднясення выніка з мэтай дае самаацэнку СР, сваім пазнавальным магчымасцям, здольнасцям і якасцям |

Пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў (далей самастойная праца) – планаваная вучэбная, вучэбна-даследчая, навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў, якая ажыццяўляецца ў пазааўдыторны час па заданні і пры метадычным кіраўніцтве выкладчыка, але без яго непасрэднага ўдзелу. Яна ўключае ў сябе:

- падрыхтоўку да аўдыторных заняткаў (лекцый, практычных, семінарскіх і інш.) і выкананне адпаведных заданняў;
- самастойную работу над асобнымі тэмамі навучальных дысцыплін у адпаведнасці з вучэбна-тэматычнымі планамі;
- напісанне рэфератаў, дакладаў, эсэ;
- выкананне пісьмовых кантрольных і курсавых работ;
- падрыхтоўку да ўсіх відаў кантрольных выпрабаванняў, у тым ліку да залікаў;
- удзел у навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, кангрэсах і т.п.

Выкананне любога віду самастойнай работы прадугледжвае праходжанне студэнтамі наступных этапаў:

- вызначэнне мэты самастойнай работы;
- канкрэтызацыя пазнавальнай (праблемнай або практычнай) задачы;
- самаацэнка гатоўнасці да самастойнай працы па рашэнні пастаўленай задачы;
- выбар адэкватнага спосабу дзеянняў, які вядзе да вырашэння задачы (выбар шляхоў і сродкаў для яе рашэння);
- планаванне (самастойна ці з дапамогай выкладчыка) самастойнай работы па рашэнні задачы;
- рэалізацыя праграмы выканання самастойнай работы.

## Метадычныя парады і рэкамендацыі да заданняў

Усе тыпы заданняў, што выконваюцца студэнтамі, у тым ліку ў працэсе самастойнай работы, так ці інакш утрымліваюць устаноўку на набыццё і замацаванне Дзяржаўным адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі аб’ёму ведаў, а таксама на фарміраванне ў рамках гэтых ведаў некаторых навыкаў разумовых аперацый – уменне ацэньваць, аналізаваць, параўноўваць, каментаваць і г.д. Некаторыя заданні патрабуюць тлумачэння:

1. Пракаментаваць выказванне – растлумачыць, якая ідэя пакладзена ва ўрыўку, аб якой пазіцыі яе аўтара яна сведчыць.

2. Параўнаць – выявіць падабенства і адрозненне пазіцый па пэўных прыкметах.

3. Абгрунтаваць адзін з некалькіх прапанаваных варыянтаў адказу - прывесці аргументы на карысць правільнасці выбранага варыянту адказу і паказаць, у чым памылковасць іншых варыянтаў.

4. Аргументаваць (абгрунтаваць, даказаць, растлумачыць) адказ.

5. Правесці аналіз – раскласці вывучаемыя з’явы на складовыя часткі, супаставіць іх з мэтай выяўлення ў іх істотнага і неабходнага.

6. Тэзісна выкласці ідэю, канцэпцыю, тэорыю – з выкарыстаннем матэрыялу вучэбных дапаможнікаў і іншай літаратуры, коратка, але не ў шкоду зместу сфармуляваць асноўныя палажэнні вучэння.

7. Адлюстраваць схематычна – значыць раскрыць змест адказу ў выглядзе табліцы, малюнка, дыяграмы і іншых графічных формаў.

Важным складнікам самастойнай пазааўдыторнай падрыхтоўкі з’яўляецца праца з літаратурай па ўсіх відах заняткаў: семінарскіх, практычных, пры падрыхтоўцы да залікаў, экзаменаў, тэсціравання, удзелу ў навуковых канферэнцыях.

Уменне працаваць з літаратурай азначае навучыцца асэнсавана карыстацца крыніцамі. Перш чым прыступіць да засваення навуковай літаратуры, рэкамендуецца чытанне падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

Вывучэнне навуковай, вучэбнай і іншай літаратуры патрабуе вядзення працоўных запісаў.

Форма запісаў можа быць вельмі разнастайнай: просты або разгорнуты план, тэзісы, цытаты, канспект. Студэнтам рэкамендуецца самастойна выконваць даклады, індывідуальныя пісьмовыя заданні і практыкаванні, прапанаваныя пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Праца, звязаная з рашэннем гэтых задач і практыкаванняў, уяўляе сабой від інтэлектуальнай практычнай дзейнасці. Яна спрыяе выпрацоўцы ўмення і звычкі рабіць што-небудзь правільна, а таксама замацаванню навыкаў і ведаў па праблеме.

Метадычныя рэкамендацыі па напісанні пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў

Напісанне пісьмовых навукова-даследчых работ студэнтаў вырашае шэраг задач:

- навучанне студэнтаў самастойнаму пошуку і адбору вучэбнай і спецыяльнай навуковай літаратуры па прадмеце;

- прывіццё навыкаў рэферыравання навуковых артыкулаў па праблематыцы вывучаемых дысцыплін;

- выпрацоўка ўменняў падрыхтоўкі рэфератаў, дакладаў, выступаў і паведамленняў;

- набыццё вопыту выступленняў з дакладамі на семінарскіх занятках;

- сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне тэарэтычных і практычных ведаў і навыкаў па вывучаемых дысцыплінах;

- далучэнне студэнтаў да вырашэння праблемных пытанняў па абранай тэме работы;

- навучанне студэнтаў выкладаць матэрыял у выглядзе стройнай сістэмы тэарэтычных палажэнняў, звязаных лагічнай паслядоўнасцю і падмацаваных прыкладамі з практыкі.

## Пералік выкарыстоўваемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для кантролю якасці адукацыі выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

Вусная форма:

- вуснае апытанне падчас заняткаў;
- калоквіум.

Пісьмовая форма:

- крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты па асобных раздзелах дысцыпліны і дысцыпліне ў цэлым;
- ацэнка рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны з выкарыстаннем манаграфічнай і перыядычнай літаратуры;
- праверка эссе;
- пісьмовы залік.

**Крытэрыі ацэньвання студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне**

| № | Узровень засваення вучэбнага матэрыялу | Балы | Тыпы і характар заданняў і пытанняў |
|---|---|---|---|
| 1<br>2 | Нізкі<br>Здавальняючы | 1 – 2<br>3 – 4 | - веданне фактаў, дат, імёнаў.<br>- тлумачэнне спецыяльных тэрмінаў;<br>суаднясенне паняццяў і азначэнняў. |
| 3<br>4 | Сярэдні<br>Дастатковы | 5 – 6<br>7 – 8 | Прадугледжвае выкананне вышэй апісаных патрабаванняў, а таксама:<br>студэнт валодае грунтоўнымі тэарэтычнымі ведамі, што ўключаюць лекцыйны матэрыял і дадатковую інфармацыю, атрыманую ў працэсе самастойнай падрыхтоўкі, ведае сутнасць і ўмее выкарыстоўваць метады і прыёмы, умее супастаўляць гістарычныя факты і праводзіць паралелі. Студэнт прымаў актыўны ўдзел у семінарскіх занятках. |
| 5 | Высокі | 9 – 10 | Прадугледжвае выкананне вышэй апісаных патрабаванняў, а таксама:<br>студэнт ведае сутнасць і змест метадаў навучання на занятках па гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі; спецыфіку і методыку Студэнт прымаў актыўны ўдзел у дыскусіях, выступаў з паведамленнямі на пераважнай большасці семінарскіх заняткаў, праявіў высокія здольнасці да навукова-даследчай работы ў працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў. |

## ЛІТАРАТУРА
## Асноўная


1. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі: дапаможнік / К. І. Баландзін; кол. авт. Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт, Кафедра гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры. - Минск : БНТУ, 2014. - 239 с.
2. Дмитрачков, П. Ф. История Беларуси. С древнейших времен до конца XVIII в.: учебно–методический комплекс / П. Ф. Дмитрачков. – Могилев: МГУ, 2015. – 353 с.
3. Пілецкі, В. А. Гісторыя культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік. - Мінск : Мінскі інавацыйны ўніверсітэт, 2017. - 401 с.
4. Шаўкун, П. В. Гісторыя культуры Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік / П. В. Шаўкун ; Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, УА "Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт". - Віцебск, 2017. – 54 с.


## Дадатковая


1. Академия наук Белорусской ССР: Краткий очерк. - Мн.: Наука и техника, 1989.
2. Архитектура Советской Белоруссии / Под общ. ред. В.И.Аникина.- М.: Стройиздат, 1986.
3. Воинов А.А. История архитектуры Белоруссии: В 2-х т. Т. 2: Советский период. 2-е изд. - Мн.: Вышэйшая школа, 1987.
4. Гаробчанка Т.Я. На мяжы стагоддзяў: Сучасны беларускі драматычны тэатр. - Мн.: Беларуская навука, 2002.
5. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. Т. 1-6. - Мн.: Навука і тэхніка, 1987-1994.
6. Гісторыя беларускага тэатра: У 3-х т. - Мн.: Навука і тэхніка, 1983-1987.
7. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2-х т. - Мн.: Навука і тэхніка, 1968-1969.
8. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4-х т. Т. 1-3. - Мн.: Беларуская навука, 1999-2001.
9. Гісторыя кінамастацтва Беларусі: У 4-х т. Т. 1: 1924 - 1959 гг. - Мн.: Беларуская навука, 2001.
10. Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX - начала XX в. - Мн.: Вышэйшая школа, 1974.
11. Дробов Л.Н. Живопись Советской Белоруссии (1917-1975). - Мн.: Вышэйшая школа, 1979.
12. История белорусского кино: В 2-х ч. - Мн.: Наука и техника, 1969-1970.
13. Качаноўскі У.У. Гісторыя культуры Беларусі: Вучэбны дапаможнік для студэнтаў ВНУ. - Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1994.
14. Кісялёў Р.Я. Школа Савецкай Беларусь - Мн.: Народная асвета, 1968.

15. Ковшаров Н.Д. История культуры Беларуси. 1917 - 90-е гг.: Учебное пособие. - Мн.: БГПУ им. М. Танка, 1999.
16. Красовский Н.И. Высшая школа Советской Белоруссии. 2-е изд. - Мн.: Вышэйшая школа, 1972.
17. Кулагин А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: Вторая половина XVIII - начало XIX в. - Мн.: Наука и техника, 1981.
18. Кулагін А.М. Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX - пачатку XX ст. - Мн.: Ураджай, 2000.
19. Лакотка А.1. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. - Мн.: Ураджай, 1999.
20. Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд: У 2-х т. 2-е выд. - Мн.: Вышэйшая школа, 1989.
21. Лойка А.А. Старабеларуская літаратура.- Мн.: Вышэйшая школа, 2001.
22. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусь 2-е выд., дап. - Мн.: ВП "Экаперспектыва", 1997.
23. Мельнікаў А.А. Кірыл, епіскап тураўскі: Жыццё. Спадчына. Светапогляд. 2-е выд. - Мн.: Беларуская навука, 2000.
24. Музыкальный театр Белоруссии: Дооктябрьский период. - Мн.: Навука і тэхніка, 1990.
25. Музычны тэатр Беларусі: 1960-1990: Балет; Музыка ў пастаноўках драматычных тэатраў. - Мн.: Беларуская навука, 1997.
26. Музычны тэатр Беларусі: 1960-1990: Опернае мастацтва; Музычная камедыя і аперэта. - Мн.: Беларуская навука, 1996.
27. Нефед В.И. Становление белорусского советского театра. 1917-1941.- Мн.: Наука и техника, 1965.
28. Очерки истории науки и культуры Беларуси IX - начала XX в. - Мн.: Навука і тэхніка, 1996.
29. Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусь 2-е выд. - Мн.: Беларуская навука, 2004.
30. Франциск Скорина и его время: Энциклопедический справочник. - Мн.: «Белорусская Советская Энциклопедия» имени Петруся Бровки, 1990.
31. Шкалаеу М.В. Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X - XVIII стагоддзях. - Мн.: Мастацкая літаратура, 1993.
32. Ходзін С.М. Гісторыя культуры Беларусі ў 1920 - 1930-я гг.: Дапаможнік для студэнтаў гістарычнага факультэта. - Мн.: БДУ, 2001.
33. Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии: В 2-х т. Т. 1: Дооктябрьский период. 3-е изд. - Мн.: Вышэйшая школа, 1985.
34. Чантурия В.А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии. - Мн.: Полымя, 1986.
35. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6-ці т. - Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1993-2003.
36. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5-ці т. - Мн.: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П.Броўкі, 1984-1987.